ДАВЕРЫЦЬ ЗЯМЛЮ ФЕРМЕРУ

АРЭХАВЫ СМАК МАКАДАМІІ, ПЕКАНА, КЕШ'Ю...

19

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ЖНІЎНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 164 (29533)

+TV ПРАГРАМА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Сёння на парадку дня гатоўнасць педкалектываў, матэрыяльна-тэхнічнай базы, забяспечанасць навучальнымі дапаможнікамі, бяспека дзяцей, захаванне адпаведных мер санэпідрэжыму. Таксама мы праводзім маніторынг работы школьных кірмашоў, ці ёсць там неабходны асартымент школьнай прадукцыі, якаснай і разнастайнай, даступнай па цане. Прыняты меры і для ўкамплектавання навучальных аўдыторый, кабінетаў. Акрамя таго, важная гатоўнасць спартыўных аб'ектаў. Стадыёны павінны быць прыведзены ў парадак. Фізічная падрыхтоўка — неад'емны атрыбут заняткаў у школах, ВНУ, ССНУ. Яшчэ адзін з найважнейшых элементаў — арганізацыя харчавання. Міністэрства аховы здароўя разам з Міністэрствам адукацыі ўнеслі свае карэкціроўкі. Мінск ідзе да таго, што ў школах будуць уведзены QR-коды. Гэта дазволіць глядзець, што дзіцяці можна, а што нельга ўжываць у ежу. Так што мы адпрацоўваем і лічбавыя аспекты арганізацыі харчавання».

СУСТРАКАЮЦЬ ПА АДЗЕЖЦЫ

Фота БелТА.

У апошнія дні лета ва ўсіх гарадах краіны працягваюць працаваць школьныя кірмашы, дзе прадстаўлены шырокі асартымент прадукцыі да новага вучэбнага года.

КАРОТКА

- **Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці правядзе з 27 да 30 жніўня масіраваную адпрацоўку аўтадарогі М3 Мінск—Віцебск.**
- У Магілёве выхаванцы дзіцячых дамоў сямейнага тыпу атрымалі падарункі да Дня ведаў ад РГА «Беларускі дзіцячы фонд».
- **Акцыя па бясплатным прававым кансультаванні студэнтаў пройдзе ў Дзень ведаў у Мінску.**

ISSN 1990 — 763X

Нашы дзеці

І «Рамонкавае поле» ў дапамогу

Няма нічога немагчымага, а інваліднасць — не прысуд

Дзесяцігадовая Ангеліна расслаблена ляжыць на кушэтцы. Да яе ножак прымацаваны апарат, праз які па іх бегаюць «мурашкі». На самай справе малой стымулююць скарачэнне мышцаў, каб калі-небудзь потым ногі дзіцяці рухаліся так, як трэба.

СТАР. 20

Фота БелТА.

Вытокі. Крок да Алімпу

Вытокі малой радзімы

Валянціна ДЫНІЧ:

«ФЕСТЫВАЛЬ НЕ ЗАКАНЧВАЕЦЦА!»

Ліда, Орша, Кобрын, Мазыр, Бабруйск, Салігорск — гарады, на якія гэтым летам інакш паглядзела ўся краіна. Сёлета яны чарговы раз увайшлі ў гісторыю Беларусі. Гэтыя райцэнтры першымі прымалі культурна-спартыўны фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу». Адзін з арганізатараў новага беларускага свята — кампанія «БелБрэндАўдыт». Разам з галерэяй «АртХаос», Нацыянальным алімпійскім камітэтам, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі яны дапамаглі беларусам інакш паглядзець на сябе і на сваю краіну. Напрыканцы лета арганізатары і ўдзельнікі з усёй дзяржавы збяруцца ў Мінску, каб падвесці вынікі і, вядома, вызначыць планы на будучыню. А пакуль для «Звязды» гэта зрабіла Валянціна ДЫНІЧ, дырэктар кампаніі «БелБрэндАўдыт».

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЭФЕКТЫЎНЫЯ І ПРЫНОСІЦЬ ПАТРЭБНЫ НАМ ВЫНІК»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Анатоля Бубена. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі актуальныя пытанні работы арганізацыі, надзённыя праблемы. Таксама ў сустрэчы прыняў удзел намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Субоцін.

«Прыйшоў час абмеркаваць сітуацыю ў «Белдзяржхарчпраме», нашым канцэрне, чытай Міністэрстве харчовай прамысловасці, так раней мы называлі гэта аб'яднанне. Шчыра кажучы, «Белдзяржхарчпрам» прыстойна мы абрэзалі з усіх бакоў. Асобныя прадпрыемствы перадалі на мясцовы ўзровень. Я так разумею, што яны і засталіся дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Мяне заўсёды насцярожвала пытанне пры перадачы зверху ўніз прадпрыемстваў, каб гэта не было прычынай і жаданнем іх прыватызаваць міма дзяржаўных органаў улады», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

«Ёсць недахопы, ёсць і станоўчыя факты»

Сёння ў склад канцэрна ўваходзяць больш за 40 прадпрыемстваў. Па словах кіраўніка дзяржавы, канцэрн невялікі, але вельмі важны. Удзельная вага «Белдзяржхарчпрама» ў агульнай суме выплачаных плацяжоў у бюджэт у цэлым па краіне складае каля 7 %. Арганізацыя забяспечвае працоўныя месцы для 20 тысяч чалавек. «Так, ***вядома, гэта не Міністэрства сельскай гаспадаркі або прамысловасці або яшчэ нейкае. Але трэба разумець, што гэта прыкладна 100 тысяч чалавек, калі сем'і ўзяць, якія жывуць дзякуючы гэтаму канцэрну***. Таму і ўдзельная вага ў бюджэце, і працуе людзей у вас нямала. Гэта сведчыць пра важнасць гэтага кірунку эканомікі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго цікавіць асобныя пазіцыі, што добра, а што дрэнна. «А ёсць і тое, і іншае. Проста каб тут не было зрушэння ў бок таго, што ўсё добра і з вашым прыходам усё квітнее. Ёсць недахопы, ёсць станоўчыя факты», — заўважыў ён.

«Сялян проста па вызначэнні крыўдзіць нельга»

Асобна Прэзідэнта цікавілі прадпрыемствы цукровай прамысловасці. Чатыры найбуйнейшыя прадпрыемствы, якія перарапрацоўваюць цукровыя буракі, увахо-дзяць у склад канцэрна.

«Якая сітуацыя там? Мы ведаем, што летась сітуацыя па продажах і цэнах на цукар была не вельмі. Але да канца года і ў пачатку гэтага года цэны на цукар проста падскочылі. Якая сітуацыя цяпер у цукраперапрацоўцы?» — запытаў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адно пытанне на парадку дня беларускі лідар прысвяціў аднасінам з сельгаспрадпрыемствамі, ад якіх «Белдзяржхарчпрам» атрымлівае сыравіну. «Ці не крыўдзіце вы сялян? ***Вяскоўцы — тыя людзі, якіх крыўдзіць нельга, ні ў якім разе.*** І не таму, што вы пазбавіцеся сыравіннай базы, вы яе ніколі не пазбавіцеся, дзяржава тут будзе рабіць усё, каб гэтая сыравінная база была. Але сялян проста па вызначэнні крыўдзіць нельга, яны ў нас не самыя багатыя», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Рэформа дзеля рэформы нікому не патрэбная»

Прэзідэнт расказаў, што ва ўрадзе намеціўся крэн па стварэнні дзяржаўных карпарацый. Яго цікавіла, чым яны будуць адрознівацца ад цяперашняга канцэрна, таксама дзяржаўнага прадпрыемства.

«Карпарацыі дык карпарацыі, ніхто не супраць. Зразумела, што ад пачатку да канца ўвесь ланцужок па вытворчасці і продажу сканцэнтраваны ў адных руках, і прыбытак вы дзеліце, і гэтак далей. Але мне цікава, як гэтая ідэя, ці ўжо практыка, кладзецца на вашу грэшную харчпрамаўскую зямлю. У чым тут адрозненне і што мы тут атрымаем», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што рэформа дзеля рэформы нікому не патрэбная. «Мы павінны быць эфектыўныя і прыносіць патрэбны і чаканы намі вынік. Перш за ўсё, грашовы. Павінен прыбытак павялічвацца, рэнтабельнасць, эфектыўнасць функцыянавання гэтага аб'яднання», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт сустрэўся з Віктарам Шэйманам

Чацвер у Прэзідэнта быў насычаны на сустрэчы. Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Віктарам Шэйманам. Віктар Шэйман далажыў кіраўніку дзяржавы аб выкананні даручэнняў па выніках паездкі ў краіны Лацінскай Амерыкі і іншых пытаннях, якія знаходзяцца ў сферы яго адказнасці.

Прымаючы ў чэрвені бягучага года адстаўку Віктара Шэймана з пасады кіраўніка справ Прэзідэнта Беларусі, Аляксандр Лукашэнка прасіў яго «не сыходзіць далёка» і падставіць плячо там, дзе гэта будзе трэба. Гаворка ў першую чаргу ішла аб рабоце з краінамі далёкага замежжа, якую курыраваў Віктар Шэйман.

❍ Каментарый у тэму

Падчас сустрэчы з Прэзідэнтам **старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Анатоль БУБЕН** расказаў, што канцэрн у 2020 і ў бягучым годзе працуе эфектыўна, выконваючы ключавыя паказчыкі і заданні. Пасля Анатоль Бубен падрабязней расказаў журналістам, аб чым ішла гаворка з кіраўніком краіны. Так, Прэзідэнт адобрыў планы па стварэнні на базе канцэрна «Белдзярхарчпрам» дзяржаўнай карпарацыі.

«Калі мы будзем адной цэлай сілай, то пераможам гульцоў на рынках»

«Мы гаварылі аб стварэнні карпарацыі, над гэтым ужо ідзе работа. На Усебеларускім сходзе прэм'ер-міністрам была пастаўлена задача аб стварэнні карпарацый у краіне. Я лічу, гэта будзе крок наперад, і Прэзідэнтам гэта было падтрымана. Ён сказаў эканамічна разлічыць мэтазгоднасць і што будзе мець дзяржава ад гэтага кроку. Я дакладваў аб тым, што карпарацыя дазволіць нам кансалідаваць сілы і агульнымі намаганнямі дасягнуць больш высокіх вынікаў, атрымаць высокі прыбытак і выпускаць больш рэнтабельную прадукцыю», — расказаў Анатоль Бубен. Таксама ён падкрэсліў, што стварэнне карпарацыі дасць магчымасць адкрываць буйныя прадстаўніцтвы ў розных рэгіёнах свету, уключаючы Кітай. Па словах Анатоля Бубена, рынак там бязмежны. «Я думаю, калі мы будзем адной цэлай сілай, то пераможам гульцоў на рынках, як алкагольным, так і кандытарскім, і гэта дасць плюсы ў многіх напрамках».

Праект указа Прэзідэнта гатовы. «Я яго абяцаў у Саўмін прадставіць 1 верасня. Прэзідэнт сказаў, што калі эканамічна гэта будзе мэтазгодна, то з новага года павінна ўжо працаваць новая карпарацыя харчовай прамысловасці», — распавёў Анатоль Бубен.

Старшыня «Белдзяржхарчпрама» расказаў, як канцэрн працуе з экспартам сваіх тавараў. За 2020-ы і за першае паўгоддзе гэтага года амаль рынак Кітая пакарылі. «За 2020 год мы ажыццявілі пастаўкі на 15 мільёнаў долараў і ў першым паўгоддзі 2021 года прыраслі яшчэ ў 1,5 раза. І думаем яшчэ нарасціць аб'ёмы экспарту. Летась мы прадалі ў Кітай 20 тысяч тон цукру, у гэтым годзе заключылі кантракт і дамовіліся на 30 тысяч тон», — адзначыў ён.

Канцэрн «Белдзяржхарчпрам» прадае сваю прадукцыю ў 72 краіны свету, у тым ліку і ў еўрапейскія.

Вельмі папулярны ў беларусаў сёлета рапсавы алей, вытворчасцю якога таксама займаюцца прадпрыемствы «Белдзяржхарчпрама». «Калі летась мы прадалі ўсяго 70 тон бутыляванага рапсавага алею за паўгоддзе, то ў гэтым годзе ўжо прадалі 1,5 тысячы тон, ёсць прырост у 20 разоў. Ён сапраўды карысны: у Германіі і ў Ізраілі спажыванне рапсавага алею — 90 працэнтаў. А ў нас да сённяшняга моманту спажыванне сланечнікавага было 90 працэнтаў. Мы ўзялі на сябе абавязак і адказнасць забяспечыць краіну рапсавым алеем», — канстатаваў Анатоль Бубен.

«Будзем з хлебам 100 працэнтаў»

Пасля даклада ў Прэзідэнта з журналістамі сустрэўся і **намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр СУБОЦІН.** Ён расказаў пра ход уборачнай кампаніі ў краіне. Асобна засяродзіў увагу на беларускае ноу-хау — вырошчванне бахчавых культур. «Мы бачым, што мяняюцца кліматычныя ўмовы, зрушваюцца крыху на поўнач. І ўжо тыя культуры, якія ў нас паспяхова калісьці апрацоўваліся на Гомельшчыне, на Брэстчыне, ужо дзесьці не падыходзяць па тэмпературных параметрах. Таму перспектывы ў бахчавых досыць высокія. Пакуль гэта адзінкавыя пасевы, адпрацоўваюцца тэхналогіі. Гэтыя культуры прыходзяць да нас і заяўляюць пра сябе ўсё гучней і гучней. Гэта толькі пачатак», — адзначыў Аляксандр Субоцін.

Але ў цэнтры ўвагі, вядома, збожжавыя культуры. «На сённяшнюю раніцу засталося прыбраць дзесьці 3-4 працэнты збожжавага кліна. Мы не дабіраем каля мільёна тон меневіта па збожжавым кліне. Але нядрэнная кукуруза, і частка пасеваў — на зерне. За кошт кукурузы мы 1,5—1,8 млн тон чакаем, што вышэй за мінулы год, і мы частку гэтага дэфіцыту перакрыем», — паведаміў Аляксандр Субоцін.

Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што гаворка ідзе не пра харчовае збожжа: «Тут можна быць зусім спакойным. Будзем з хлебам 100 працэнтаў», — заўважыў Аляксандр Субоцін. А вось фуражнага збожжа будзе сабрана менш, чым прагназавалася, але пры гэтым ёсць варыянты замяшчэння.

Частка збожжа будзе закуплена ў Расіі. «У нас будуецца і запускаецца ў лістападзе апошні высокатэхналагічны завод Беларускай біятэхналагічнай карпарацыі. Там будзе вельмі паглыбленая перапрацоўка збожжа: атрыманне вітамінаў, ферментаў, крухмалу і гэтак далей. Для ўсёй лінейкі прадукцыі трэба збожжа, якое ў нас проста не расце: не тая тэмпература, клейкавіна не тая», — растлумачыў Аляксандр Субоцін.

Па словах віцэ-прэм'ера, прыярытэт сёлетняй уборачнай кампаніі — унутраны рынак. «Мы робім акцэнт на тым, каб максімальна больш прыбытку зарабіць у нас у краіне і пакінуць у нас у краіне», — канстатаваў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

АКТУАЛЬНЫ ДЫЯЛОГ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 28 жніўня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу правядуць:

ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч, старшыня Брэсцкага аблвыканкама (80162213121),

ПЕНІН Уладзімір Пятровіч, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама (80212222222),

КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна, кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама (80232331237),

ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама (80152735644),

ГУРЫНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч, кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама (80175004160),

ДЗЯДКОЎ Мікалай Леанідавіч, кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама (80222501869),

ДАРАХОВІЧ Аляксандр Вікенцьевіч, намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама (80172224444).

Меркаванне

ЗДРАДА ЗАМЕСТ ДЭМАКРАТЫІ

Наталля ТАРАСЕНКА, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— Сёння склалася вельмі напружаная сітуацыя па бежанцах. І наша краіна заняла ў ёй вельмі дастойную пазіцыю. Што б ні адбывалася на граніцы з Літвой, Латвіяй, Польшчай, неабходную падтрымку бежанцам, першую дапамогу ў крытычнай сітуацыі аказваем мы. Дастаткова ўспомніць інцыдэнт са смяротна параненым літоўскімі пагранічнікамі мігрантам з Ірака, або з непрытомнай цяжарнай жанчынай, якую прадстаўнікі «дэмакратычнай» дзяржавы перацягнулі на беларускі бок і кінулі паміраць. Менавіта наша краіна аказала ёй першую дапамогу. Беларусь застаецца на пазіцыях разумення, міралюбнасці, падтрымкі людзей, якія аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Мы вельмі разумна выбудоўваем дзяржаўную палітыку ў адносінах да бежанцаў. Але яны ідуць не да нас, мы з'яўляемся для іх толькі транзітнай тэрыторыяй. Іх мэта — Еўрасаюз і атрыманне тых еўрапейскіх выгод, якія ім, па сутнасці, паабяцалі еўрапейскія палітыкі, калі прынеслі вайну ў іх краіны. Бежанцы ў выніку той сітуацыі, якая стварылася ў іх краінах, не могуць там спакойна жыць, гадаваць сваіх дзяцей, атрымліваць дастойны ўзровень адукацыі, тую работу, якая б забяспечыла дабрабыт іх сем'яў. Яны ідуць у Еўрасаюз са спадзяваннем, што людзі, якія паабяцалі ім дэмакратыю, цяпер усе дэмакратычныя прынцыпы ажыццяўляць у адносінах і да іх. Вельмі шкада бежанцаў, іх дзяцей, цяжарных маці. Яны ідуць за блакітнай марай і не ведаюць, што яна можа быць зусім іншага колеру. Еўрапейскія краіны, іх кіраўнікі павінны несці поўную адказнасць за тыя абяцанні, якія яны даюць жыхарам разбураных імі краін. Сёння вельмі востра паўстала праблема з Афганістанам. Я лічу, што гэта здрада тых, хто прыйшоў у Афганістан і цяпер адхрышчваецца ад паняцця дэмакратыі на гэтай зямлі. З якой мэтай яны прыходзілі туды? Перамагчы тэрарызм? Але яны гэтага не зрабілі. Навошта тады трэба было знаходзіцца там 20 гадоў? Якую надзею яны ўсе гэтыя 20 гадоў давалі жыхарам? І цяпер, калі цалкам зразумела, што новая ўлада не будзе лаяльная да гэтых людзей і не дарэ супрацоўніцтва з амерыканцамі, ім адмаўляюць у прыстанішчы, фактычна асуджваючы іх на смерць. Гэта бесчалавечна.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.

Класныя навіны

АДУКАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ЭКСКУРСІЙ

Пераход беларускай школы на новыя навучальныя планы, які распачаўся ў 2015/2016 навучальным годзе, фінішуе. З 1 верасня па новых навучальных планах будуць навучацца ўжо і вучні адзінаццатых класаў (на базавым і павышаным узроўнях). Пра гэта паведаміла журналістам начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.

У бягучым годзе запланавана выдаць 41 вучэбны дапаможнік, з іх 14 — па новых праграмах для адзінаццацікласнікаў. Да 1 верасня ўсе вучэбныя дапаможнікі будуць дастаўлены ў школы. Таксама электронныя версіі вучэбных дапаможнікаў, рэкамендаваных для выкарыстання ў навучальным працэсе, можна знайсці на Нацыянальным адукацыйным партале.

Усяго ў новым навучальным годзе за парты сядуць 1 мільён 85 тысяч навучэнцаў. На працягу шэрагу апошніх гадоў і агульная колькасць школьнікаў, і колькасць першакласнікаў у нашай краіне працягвала расці. Так, у бягучым годзе ў першыя класы прыйдуць 118 тысяч дзяцей.

Сёння практычна ва ўсіх школ ужо ёсць сертыфікаты гатоўнасці. «Пры падпісанні такіх сертыфікатаў улічваецца не толькі завяршэнне рамонтных работ, — падкрэсліла Ірына Каржова. — Пад увагу бярэцца забеспячэнне ўстаноў адукацыі педагагічнымі кадрамі, падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі, метадычнымі матэрыяламі... Дарэчы, сістэму адукацыі сёлета папоўніць шэсць тысяч маладых спецыялістаў».

Урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя пачатку навучальнага года і Дню ведаў, пройдуць ва ўстановах адукацыі 1 верасня з удзелам запрошаных прадстаўнікоў шэфскіх арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, грамадскіх дзеячаў, вядомых выпускнікоў.

У новым навучальным годзе на старшай ступені школы будуць дзейнічаць педагагічныя, аграрныя класы, класы спартыўна-патрыятычнага і ваенна-патрыятычнага профіляў.

Для навучэнцаў базавых класаў старшай школы прадугледжаны курс прафесійнай падрыхтоўкі ў рамках прадмета «Працоўнае навучанне». «У 2021/2022 навучальным годзе актуалізаваны пералік прафесій, якія могуць засвойвацца навучэнцамі 10—11-х класаў. Гэты пералік прадугледжвае толькі тыя прафесіі, па якіх магчымая здача кваліфікацыйнага экзамену, — падкрэсліла Ірына Каржова».

Асобнае месца ў гэтым навучальным годзе адводзіцца адукацыйным экскурсіям, якія праводзяцца ў рамках вывучэння вучэбных прадметаў.

— З 1 верасня запланавана рэалізацыя пілотнага праекта, у рамках якога будуць арганізаваны экскурсіі для навучэнцаў 10—11-х класаў — адна экскурсія на паўгоддзе, — паведаміла Ірына Каржова. — Для кожнай вобласці падрыхтаваны пералік экскурсійных аб'ектаў, рэкамендаваных для абавязковага наведвання ў рамках тэм вучэбных прадметаў, распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па правядзенні такіх экскурсій.

Таксама з 1 верасня ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ўводзіцца новая пасада — кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні. Асноўныя напрамкамі дзейнасці новых спецыялістаў у школе — патрыятычнае выхаванне, каардынацыя работы па арганізацыі дапрызыўнай падрыхтоўкі, у тым ліку ўзаемадзеянне з камандзірамі воінскіх часцей, падраздзяленняў, начальнікамі ваенных факультэтаў і кафедраў, кантроль за захаваннем патрабаванняў па ахове працы і правіламі пажарнай бяспекі.

Службовыя абавязкі і кваліфікацыйныя патрабаванні кіраўнікоў па ваенна-патрыятычным выхаванні, умовы аплаты іх працы зацверджаныя адпаведнымі прававымі актамі. У тыпавыя штаты ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі ўведзена пасада «кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні».

Ірына Каржова дадала, што новы спецыяліст, акрамя выканання сваіх асноўных абавязкаў кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні, зможа весці ў школе вучэбныя заняткі па дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўцы, займацца арганізацыі вучэбна-палявых збораў для дзесяцікласнікаў, весці прадмет «Асновы бяспечнай жыццядзейнасці», факультатыў па бяспечнай жыццядзейнасці і факультатыўныя заняткі ваенна-патрыятычнай накіраванасці, праграмы якіх ужо зацверджаны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Надвор'е

ДАЖДЖЫ, ДАЖДЖЫ, ДАЖДЖЫ...

Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Як распавялі сіноптыкі, на працягу тыдня надвор'е ў розных частках Беларусі істотна адрозніваласа. Паўднёвыя і паўднёва-ўсходнія раёны знаходзіліся пад уплывам сістэмы маларухомых атмасферных франтоў, і там назіралася пахмурнае з дажджамі надвор'е, у той час як у цэнтральных і паўночных раёнах Беларусі было без ападкаў і ў цэлым больш камфортнае надвор'е. Адметнасцю стаў паніжаны тэмпературны фон: цяпер сярэднясутачныя тэмпературы па краіне знаходзяцца ў межах плюс 10-16, што на 1-5 градусаў ніжэй за кліматычную норму.

У канцы тыдня надвор'е ў Беларусі будуць вызначаць зона паніжанага атмасфернага ціску і франтальныя раздзелы ад цыклону з цэнтрам над поўднем Балтыкі і поўначчу Польшчы. Чакаецца няўстойлівае і з паніжаным тэмпературным фонам надвор'е.

У пятніцу, 27 жніўня, месцамі па краіне, а па паўночным усходзе на большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы. У асобных раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей чакаюцца моцныя дажджы. Днём месцамі прагрымяць навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8-14, месцамі плюс 5-7 градусаў. Днём будзе 16-22 цяпла.

У суботу, 28 жніўня, на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах — навальніцы. Ноччу і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8-13, месцамі да плюс 15 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 16-23, у асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны будзе да плюс 25.

У нядзелю, 29 жніўня, ноччу месцамі, днём на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7-14. Днём будзе плюс 16-23, у паўднёва-ўсходніх раёнах месцамі да 27 цяпла.

У пачатку наступнага тыдня на большай частцы краіны надвор'е будзе вызначаць актыўная сістэма франтоў, якія ссоўваюцца з Украіны, на ўсходзе Беларусі адаб'ецца ўплыў цёплых паветраных мас паўднёвага паходжання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Алімпійскі дзённік

ІГАР БОКІЙ — ЗНОЎ ЧЭМПІЁН

Другі дзень спаборніцтваў — другі залаты медаль. Гэта мара кожнага спартсмена, кожнага аматара, якую надоечы на Параалімпійскіх гульнях у Токіа ажыццявіў Ігар Бокій. Другі залаты медаль сярод плыўцоў класа S13 беларус узяў на дыстанцыі 100 метраў. На Параалімпіядзе 2016 года ў Рыа Ігар таксама быў трыумфатарам гэтай праграмы, устанавіўшы сусветны і параалімпійскі рэкорды. Тады ён пераадолеў дыстанцыю за 56,68 секунды. У Токіа ўраджэнец Бабруйска пераўзышоў тыя паказчыкі. Цяпер яго «залаты» час — 56,36 секунды.

На старт той жа дыстанцыі ў гэтым класе сёння выходзіў і Уладзімір Сотнікаў. Але ён не змог прабіцца ў фінальны заплыў, заняўшы выніковае 10-е месца. Яго час — 1 хв. 06.21 секунды.

Параалімпійскае плаванне. Гэта спорт, адкрыты для мужчын і для жанчын. Ім займаюцца спартсмены, якія ўваходзяць у 14 класаў пашкоджанняў здароўя, яны могуць мець фізічныя, зрокавыя і інтэлектуальныя парушэнні. Праводзяцца спаборніцтвы па плаванні на спіне, брасам, батэрфляем, вольным і комплексным стылем і эстафетныя заплывы.

Фехтаванне на інвалідных каляскаx. Андрэй Праневіч скончыў сваё выступленне на шпагах. Ён паспяхова прайшоў кваліфікацыю, прабіўся ў чвэрцьфінал. Але ў паўфінале ўступіў расіяніну Аляксандру Кузюкову з вынікам 13:15. У паядынку за трэцяе месца Андрэй прайграў лідару сусветнага рэйтынгу Дзмітрыю Кауціа з Вялікабрытаніі з вынікам 11:15. Такім чынам Андрэй Праневіч застаўся на чацвёртым радку выніковага пратакола.

Цікавы факт. Першапраходзец фехтавання на інвалідных каляскаx — Людвік Гутман, бацька параалімпійскага руху. Ён сам захапляўся фехтаваннем і ўбачыў, што гэты спорт мае вялікі патэнцыял для рэабілітацыі людзей з траўмамі пазваночніка.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Талібы лічаць, што Захад забірае з Афганістана каштоўных для краіны людзей

Заходнія краіны вывозяць з Кабула тых людзей, якія маглі б прынесці карысць у Афганістане, заявіў прадстаўнік руху «Талібан» Забіхула Муджахід, паведамляе ТАСС.

«Краіны Захаду не павінны ўмешвацца ў справы нашай краіны і забіраць чалавечыя рэсурсы: дактароў, прафесараў і іншых людзей, якія патрэбныя нам тут. У Амерыцы яны могуць стаць кухарамі ці пасудамыйшчыкамі. Гэта не па-людску», — заявіў прадстаўнік «Талібану».

Забіхула Муджахід дадаў, што ўсе, у каго ёсць законныя дакументы для таго, каб пакінуць краіну, змогуць без перашкод прайсці ў сталічны аэрапорт.

Як паведамілі раней у Белым доме, у цэлым з 14 жніўня ЗША эвакуіравалі з Афганістана больш за 82 тысяч чалавек, з іх толькі 4,5 тысячы — амерыканцы і члены іх сем'яў.

Сёння вылецець з Афганістана спрабуюць тысячы людзей. Для разгону натоўпу на ўзлётна-пасадачнай паласе ваенным, у тым ліку амерыканскім, даводзілася ўжываць слёзатачывы газ і страляць у паветра. Людзі чапляліся за шасі і фюзеляжы самалётаў, каб пакінуць Кабул. Паводле апошніх даных, у выніку гэтых інцыдэнтаў на працягу тыдня загінула не менш за 20 чалавек. Адказнасць за сітуацыю ў паветранай гавані сталіцы радыкалы ўсклалі на ЗША.

Байдэну прапанавалі аб'явіць імпічмент з-за «капітуляцыі» талібам

Сенатар-рэспубліканец Ліндсі Грэм заявіў, што прэзідэнт ЗША Джо Байдэн павінен быць падвергнуты імпічменту за рашэнне вывесці амерыканскія войскі з Афганістана. Пра гэта паведамляе The Hill.



«Я думаю, Джо Байдэн заслугоўвае імпічменту, таму што ён кінуў тысячы афганцаў, якія заявалі разам з намі, і збіраецца кінуць частку амерыканскіх грамадзян, таму што капітуляваў перад «Талібанам», — сказаў Грэм.

Сенатар назваў рашэнне амерыканскага лідара «самым ганебным учынкам галоўнакамандуючага за ўсю сучасную гісторыю». «Калі б я быў прэзідэнтам Злучаных Штатаў, я сказаў бы талібам ісці да д'ябла. Мы збіраемся заставацца тут столькі, колькі спатрэбіцца, каб вывезці нашых людзей», — сказаў ён.

ЗША павінны завяршыць эвакуацыю ўсіх сваіх грамадзян, якія знаходзяцца на тэрыторыі Афганістана, да 31 жніўня. Пры гэтым амерыканскі прэзідэнт Джо Байдэн паведамляў, што абмяркоўвае пытанне аб падаўжэнні тэрмінаў.

Авіякампанія Delta прымусіць невакцынаваных супрацоўнікаў штомесяц плаціць $200

Адна з найбуйнейшых амерыканскіх авіякампаній Delta Air Lines уводзіць новыя правілы для невакцынаваных ад COVID-19 супрацоўнікаў, якія ўключаюць у тым ліку павелічэнне страхавых узносаў на $200, паведамляе тэлеканал CNBC.

З 1 лістапада ўсе непрышчэпленыя супрацоўнікі авіякампаніі сутыкнуцца са штомесячнымі даплатамі да страхавых узносаў у памеры $200. «Гэтая дадатковая плата будзе неабходная для ліквідацыі фінансавай рызыкі, што ўзнікае для кампаніі з адмовай супрацоўніка ад прышчэпкі», — адзначыў генеральны дырэктар авіякампаніі Эд Бастыян.

Таксама з 12 верасня невакцынаваныя супрацоўнікі будуць абавязаны штотыдзень здаваць тэсты на каранавірусную інфекцыю і насіць маскі ў памяшканні.

Гэтыя меры з'яўляюцца апошняй спробай авіякампаніі павысіць узровень вакцынацыі сярод супрацоўнікаў.

Эд Бастыян сказаў, што каля 75 % супрацоўнікаў Delta ўжо вакцынавана. «Агрэсіўнасць штама «дэльта» азначае тое, што нам трэба вакцынаваць значна больш нашых супрацоўнікаў, прычым як мага бліжэй да 100 %», — сказаў ён.

Бяспека

Палова поспеху — ва ўзаемадзеянні

У Дзяржынскім раёне праходзяць маштабныя комплексныя вучэнні

Каля вёскі Садкаўшчына ў выніку моцнага ветру і дажджу на лінію электрапередачы ўпала дрэва — абарвалася высакавольтная лінія. Каб пад электрычнае напружанне не трапілі ні людзі, ні жывёлы, на месца надзвычайнай сітуацыі выехалі як ратавальнікі, так і энергетыкі, леснікі, супрацоўнікі міліцыі і медыцынскія работнікі.

Смяротнае напружанне

Нягледзячы на тое што абрыў высакавольтнай лініі — толькі легенда вучэння, кожны са спецыялістаў прафесійна выканаў свае задачы. Падчас падобных мерапрыемстваў адбываецца ўзаемадзеянне прадстаўнікоў розных структур. І толькі іх зладжаныя сумесныя дзеянні гарантуюць поспех у рэальнай надзвычайнай сітуацыі. А як паказала гэтае лета, наступствы непагадзі могуць быць і такія.

— Літаральна днямі ў выніку ўзмацнення ветру і навальніцы падчас пашкоджання ліній электрапередачы адбылося масавае адключэнне электраэнергіі ў нашым раёне, — расказаў **начальнік Дзяржынскіх раённых электрычных сетак Аляксандр ПІШЧЫК.** — Увесь наш састаў быў мабілізаваны для ліквідацыі наступстваў непагадзі. Таксама нам аказвалі дапамогу калегі з Нясвіжскага, Клецкага і Стаўбцоўскага раёнаў. У цяперашні момант на прасеках, дзе праходзяць высакавольтныя лініі электрапередачы, у нашым раёне адбываюцца мерапрыемствы па замене неізаляваных правадоў на ізаляваныя, для таго каб мінімізаваць адключэнне электраэнергіі ў спажыўцоў пры падзенні дрэў на правады.

Варта ведаць, што набліжэнне да абарваных правадоў бліжэй чым на восем метраў пагражае смяротным зыходам. Каб захаваць жыццё, а таксама пазбегнуць траўмаў, варта выконваць простыя нормы электрычнай бяспекі:

— звяртаць увагу на размешчаныя на энергааб'ектах знакі, якія папярэджваюць аб небяспецы;

— не набліжацца да абвіслых і абарваных правадоў паветраных ліній электрапередачы;

— не падыходзіць да абарванага провада паветраных ліній электрапередачы, які ляжыць на зямлі, бліжэй чым на 8 метраў;

— не здзяйсняць супрацьпраўных дзеянняў, якія могуць парушыць звычайную работу электрычных сетак, прывесці да іх пашкоджання або траўмаваць;

— не трапляць за агароджы, не адчыняць дзверцы дзеючых электраўстановак і не праводзіць у іх ніякіх пераключэнняў.

Аварыя ў 20-градусны мароз

Па задуме яшчэ аднаго з этапаў вучэнняў, якія праходзяць на Дзяржыншчыне з 25 да 27 жніўня, з-за цыклону з ураганным ветрам на аўтадарозе каля вёскі Петкавічы ўтварыліся снежныя сумёты. Акрамя таго, на дарогу ўпала некалькі дрэў, у выніку чаго адбылося дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам міжгародняга экскурсійнага аўтобуса, які перавозіў дзяцей, і легкавога аўтамабіля. Ёсць пацярпелыя. З-за аварыі па абодвух напрамках спыніўся транспарт. А на вуліцы — 20 градусаў марозу.

Першыя на месца здарэння прыбылі ратавальнікі. Супрацоўнікі Дзяржынскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях аператыўна патушылі ўзгаранне, якое адбылося ў выніку сутыкнення транспартных сродкаў, дэблакавалі пацярпелых. Апошніх перадалі медыкам, што прыбылі на месца здарэння ў лічаныя хвіліны. Аварыйная брыгада філіяла дарожна-эксплуатацыйнага ўпраўлення № 62 ажыццявіла работы па прыборцы дрэў з праезнай часткі, расчысціла дарогу ад снежных сумётаў. Аўтамабільны рух быў адноўлены. А тым часам удзельнікі дарожнага руху, якія апынуліся ў заторы, а таксама пасажыры транспартных сродкаў, якія стварылі аварыйную сітуацыю, грэліся ў палатках пад знакам Чырвонага Крыжа.

— Ад зладжанасці дзеянняў усіх службаў і арганізацый раёна залежыць канчатковы вынік ліквідацыі той ці іншай надзвычайнай сітуацыі, — адзначыў **намеснік старшыні Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта Дзяніс ПРАКОПЧЫК.** — Вучэнне паказвае нашы магчымасці: наколькі мы гатовыя да ліквідацыі

праблем, што нам могуць паднесці як прырода, так і людзі. Поспех залежыць і ад таго, наколькі аператыўнымі з'яўляюцца рашэнні як кіраўніцтва, так і супрацоўнікаў тых арганізацый, што задзейнічаны.

Як канстатаваў **першы намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Уладзімір ЯНЧЫК,** па выніках першых уводных вучэнняў можна сказаць, што ўсе сілы і сродкі Дзяржынскага раёна гатовыя рэагаваць і спраўляцца з пазаштатнымі сітуацыямі. «У кожным рэгіёне, дзе мы праводзім вучэнні, імкнёмся адпрацоўваць найбольш характэрныя сітуацыі, якія ўзнікаюць на працягу года, — удакладніў прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — У асноўным гэта аварыі ў сістэмах жыццезабеспячэння, на транспарце — тыя сітуацыі, якія могуць узнікнуць у любы час. Прычым падчас вучэнняў мы ацэньваем не толькі магчымасці рэагавання на здарэнне, але і выкананне тэхнікі бяспекі, прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў, задзейнічанне ў ліквідацыі надзвычайнай сітуацыі ўсіх зацікаўленых асоб».

Вераніка КАНЮТА.
Фота Аліны МАЗАВЕЦ,
Дзяржынскі раён.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «СМАЧНАЯ ВОСЕНЬ СА «ЗВЯЗДОЙ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Смачная восень са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмінам з 1 верасня 2021 года да 31 снежня 2021 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара Гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ, руб. кап.	Усяго з ПДВ, руб. кап.
1	Мультыварка Holt HT-MC — 005, (далей — суперпрыз)	1	165,00	165,00
2	Тостар Galaxy GL 2909, (далей — прыз)	7	39,204	274,43

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» складае: 439,43 (чатырыста трыццаць дзевяць) рублёў сорак тры капейкі.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Смачная восень са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 верасня да 14 кастрычніка 2021 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 верасня да 14 кастрычніка 2021 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксераканіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 14 кастрычніка 2021 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Смачная восень са «Звяздой» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна, намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда», старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна, начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Дашкевіч Юлія Андрэеўна, намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна, рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч, загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 22 кастрычніка 2021 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 30 кастрычніка 2021 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 30 кастрычніка 2021 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2021 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 31 снежня 2021 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка па суботу (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах (017) 263 66 73, 287 17 40, для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2021 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах (017) 263 66 73, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4064 ад 20.08.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

«ФЕСТЫВАЛЬ НЕ ЗАКАНЧВАЕЦЦА!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Валянціна Іванаўна, цяпер усе размовы пра вынікі праекта «Вытокі. Крок да Алімпу». А вы памятаеце, як усё пачыналася?

— Першапачаткова праект задумваўся ў лакальным маштабе. Ініцыятарамі былі «БелБрэндАўдыт» і галерэя «АртХаос». Мы планавалі рабіць акцэнт на адукацыі, мастацтве і на ўсім тым, што называецца культурай. І нам вельмі пашанцавала. Душа, розум — усё гэта было задзейнічанае ў мастацтве, нашых семінарах, але... цела таксама павінна працаваць! І таму падключыўся спорт, змянілася культурная праграма, яна стала больш відовішчнай — усё адбывалася натуральна. Гэта было летам мінулага года, калі закрыліся граніцы і ўсе сумавалі, нікуды не выходзілі. Мне здаецца, у той час свет ужо дайшоў да мяжы, калі праз глабалізацыю, важныя сусветныя праблемы пачало губляцца галоўнае ў самім чалавеку. І вяртанне да сваёй гісторыі, культуры было натуральным крокам. Менавіта летась мы зразумелі, што трэба нешта рабіць, абапіраючыся на сваё, роднае. Назва «Вытокі» з'явілася пазней і стала сімвалам таго, адкуль і куды мы ідзём. Бо, абапіраючыся на гісторыю, мы ўсе будуем сваю будучыню. А ў гісторыі заўсёды шукаем нейкія прыклады, аналогіі, базу. І з тым, што знайшлі, выбудоўваем шлях. Зразумела, што на гэтым шляху патрэбна арыентавацца на свае карані.

Аўтарскія лыжкі.

Мне хочацца падкрэсліць асаблівую ролю Нацыянальнага алімпійскага камітэта ў праекце «Вытокі. Крок да Алімпу». Камітэт дадаў дынамікі. Той уплыў, які фестываль набыў і пачаў аказваць пасля, стаў магчымы дзякуючы НАК і Федэрацыі прафсаюзаў. Алімпійскі дзень жа і раней праводзіўся, але толькі ў Мінску. А так, я думаю і алімпійскі камітэт упэўніўся, што ў рэгіёнах цікавейшае жыццё. І мы ўсе ў гэтым упэўніліся.

«Брэнд — гэта адметнасць, тое, што вылучае. І калі самі рэгіёны вызначацца, чым яны адрозніваюцца, тады і ўзнікне брэнд краіны. Гэта як мазаіка, якая складаецца з розных кампанентаў».

— Мінулае лета стала часам, калі ўсе пачалі актыўна вандраваць па Беларусі...

— І захапляцца тым, што тут ёсць. І цяпер у знакамітую песню «Каб любіць Беларусь, нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць» трэба ўстаўляць «у родных краях пабываць». І, пабываўшы тут, усклікнуць: «Колькі ў нас усяго цікавага!»

— Цяпер, калі ў гэтым годзе фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» заканчваюцца, можаце падвесці вынікі? Ці ўсё задуманае ўдалося ажыццявіць?

— Некаторыя моманты нават пераўзышлі нашы чаканні. Мы рэалізавалі ўсё, што хацелі, на 100 працэнтаў. Многае мы ўбачылі ўжо падчас фестывалю і па дарозе падхапілі пэўныя моманты. Мы крыху інакш планавалі канцэртную праграму, але атрымалася так, як атрымалася. Магчыма, спачатку мы менш думалі пра конкурсы, але яны былі выдатнымі. Вельмі хочацца, каб усе разумелі, што фестываль не заканчваецца. І не таму, што мы будуем планы і думаем, якім фестываль будзе на наступны год. А таму, што падчас кожнага мерапрыемства, у кожным горадзе разглядаўся стан унутранага турызму, рэгіянальных ініцыятыў, у тым ліку і маладзёжных. У многіх рэчах мы можам быць карысныя. Мы не абмяжоўваемся простым правядзеннем фестывалю, не кажам «Мы знайшлі і ідзём далей». У нас ёсць задача — вырашыць, што рабіць з неабыякавымі людзьмі, з праектамі, якія мы адкрылі. У кожным рэгіёне вельмі шмат энтузіястаў, і гэта сапраўды выдатная супольнасць. З гэтымі людзьмі трэба працаваць, каб усе іх ідэі былі рэалізаваныя. Таму цяпер мы думаем, які працяг даць кожнаму кругламу сталу, семінару і размове, якія праводзіліся гэтым летам.

Гульня «Хатнік».

— Канкрэтныя ідэі ўжо ёсць?

— Мы зрабілі брашуру па слядах семінараў «Маладзёжны брэнд». Мы адбіралі няшмат праектаў, каб кожны меў магчымасць на рэалізацыю, і не ў далёкай, а ў блізкай перспектыве. Падчас фестывалю ў Мінску мы збяром аўтараў гэтых праектаў, правядзём для іх кансультацыю з прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў. Спадзяюся, у рэалізацыі праектаў гэта будзе вялікі крок. Мы акумулюем літаратурныя творы, якія былі прадстаўленыя на нашых літаратурна-музыкальных салонах. Мы ўбачылі, што ў рэгіёнах ёсць выдатныя паэты. Я не буду ацэньваць іх прафесійна, але хачу аціаніць тых, хто сваімі творамі закранае душу. Многія ўмела і вельмі трапна выкарыстоўваюць дыялекты. Магчыма, мы арганізуем для іх публікацыю ў часопісах пад асобнай рубрыкай. Гэта, можа быць, не вялікая паэзія, але трэба паказаць усім такое душэўнае слова.

— У музеі «Палеская веда» ў Мазыры вы прапанавалі цікавую ідэю — выкарыстоўваць музейныя экспанаты на ўроках фізікі. Напрыклад, паказваць школьнікам, як нашы продкі падтрымлівалі агонь у хаце ці займаліся бортніцтвам. А яшчэ падобныя незвычайныя ідэі ў вас былі?

— У кожным рэгіёне было мноства ідэй. Напрыклад, ёсць выдатны праект «Пазнай Кобрын». І ўсе матэрыялы гэтага праекта можна выкарыстоўваць у школе. Праект пачаўся, у тым ліку, знаёмствам з асобай матэматыка Аскара Зарыскага, які жыў у Кобрыне. І гісторыі выдатных людзей, звязаных з нашай краінай, можна ўключыць у кожны падручнік, па фізіцы, па матэматыцы, па хіміі і г. д. І не проста згадаўшы іх імёны, а падкрэсліўшы іх ролю ў развіцці навукі, тэхнікі, тэхналогій. І вучні інакш паглядзяць на гэтыя прадметы. У кожнага будзе сваё стаўленне да прадмета. І такіх прыкладаў можна праводзіць безліч.

— А які працяг будзе ў круглых сталоў, прысвечаных гісторыка-культурнай спадчыне кожнага горада?

— Увогуле, вельмі добра, што мы пачыналі праграму фестывалю менавіта з круглых сталоў. Экскурсаводы, супрацоўнікі краязнаўчых музеяў выдатна ведаюць свой рэгіён. На кожным круглым стале былі тыя, каму не ўсё роўна. Мы з імі знаёміліся, абменьваліся кантактамі. І я спадзяюся, што мы ўсе разам сустрэнемся і вырашым, як нам аб'яднаць намаганні.

— Вельмі цікава, што першы дзень фестывалю пачынаўся з круглага стала аб гісторыка-культурнай спадчыне, а завяршаўся адкрыццём выстаўкі сучаснага мастацтва. Сапраўды «Кола часу»...

— Вельмі многае залежыць ад людзей. І нам пашчасціла сустрэцца з тымі, хто разумее, што мінулае само па сабе вельмі цікавае, але трэба знайсці ў ім тое, што зацікавіць сучаснікаў. І ў кожным рэгіёне былі выдатныя партнёры і аднадумцы, якія на сваю гісторыю глядзелі з сучаснай пазіцыі, і, дзякуючы гэтаму, у нас заўсёды былі тэмы для размовы. Напрыклад, выдатны музей у Мазыры і яго канцэпцыя: кожная экспазіцыя — адзін жыццёвы этап. Гэта ж зрабіў сучасны чалавек, спецыяліст. Проста сабраць старыя рэчы — вельмі міла. Але гэта можа не закрануць так, як закранае, калі глядзець на іх з пазіцыі сучаснасці.

Мы нікога не заганялі на нашы мерапрыемствы. Для нас галоўнай была якасць, а не колькасць. І «Вытокі» — гэта мерапрыемства, якое стала адгукацца сваім пасылам «а давайце абмяркуем, нам гэта цікава, і потым давайце зробім».

— Валянціна Іванаўна, аб'ехаўшы ўсю краіну, ці адкрылі вы нейкія рэчы, якія вас асабіста вельмі здзівілі?

— Пачну з людзей. У нас столькі вельмі цікавых народных майстроў! Выдатныя людзі дасканала ведаюць і адстойваюць свае тэхналогіі. І яны ведаюць гісторыю свайго занятку. Мы ўсе разумеем, што з гліны робяць розныя рэчы, абпальваюць яе ў печы. Але я не ведала, што часам яе абпальваюць з мукой. А ад гэтага атрымліваецца такі цікавы малюнак, мне здаецца, нават водар іншы ў выраба, і форма іншая. І з гэтай тонкасцю звязана столькі традыцый. У Мазыры мяне вельмі здзівілі іх збіцень і медавуха. Я вельмі разлічваю, што пасля «Вытокаў» у кожнага рэгіёна з'явяцца свае аматары па ўсёй краіне.

«З гэтымі людзьмі трэба працаваць, каб усе іх ідэі былі рэалізаваныя. Таму цяпер мы думаем, які працяг даць кожнаму кругламу сталу, семінару і размове, якія праводзілі гэтым летам».

— А сярод творчых праектаў што б вы маглі вылучыць?

— Было шмат цікавых праектаў, прысвечаных расповедам аб рэгіёне праз мабільныя дадаткі (напрыклад, праект з Ліды). Сёння гэта вельмі важна і цікава. Яшчэ я б вылучыла праект па стварэнні лыжак. Майстар сам вырабляе лыжкі для кожнага індывідуальна, для дзяцей, для дарослых. Ён размалёўвае іх экалагічна чыстымі фарбамі. Здавалася б, мы столькі гэтых лыжак бачылі, а яго пасля выступлення 15 хвілін не адпускалі. У Кобрыне была прадстаўлена цікавая гульня для дзяцей і дарослых «Хатнік». Яна вырашае мноства задач, дамагае пазнаёміцца з народнымі майстрамі рэгіёна. У Віцебску школьнікі робяць выдатны экалагічны праект у выглядзе гульні тыпу «манаполіі». Цікавыя праекты можна пералічваць і далей. І мы сабе не даруем, калі яны не ўбачаць свет.

— Адным з крытэрыяў выбару горада для фестывалю была спартыўная гісторыя. Валянціна Іванаўна, можаце кожнаму гораду даць невялікую характарыстыку, на якую вы абапіраліся, выбіраючы яго?

— Сапраўды, Нацыянальны алімпійскі камітэт глядзеў на спартыўнае жыццё горада, мы — на асаблівасці культуры і гісторыі. І хачу сказаць, што мы не супалі толькі ў Мінскай вобласці. У Кобрыне выдатнае спалучэнне вялікіх імёнаў, народных традыцый. Я нават не магу вылучыць нешта адно. Там і вялікае імя Суворава, найцікавейшыя падзеі вайны 1812-га і іншых гістарычных перыядаў, унікальны строй Лелікаўскай свахі. Мазыр — асаблівае Палессе, і якія там багатыя традыцыі тэатра, выяўленчага мастацтва! Бабруйск — гэта відавочная культура, якую абавязкова трэба было падкрэсліць і паказаць, як людзі розных рэлігій жылі разам і сябравалі, паважалі адно аднаго. Гісторыя горада стала нагодай для вельмі важнай размовы. Орша цікавая не толькі сваёй ваеннай гісторыяй. Гэты горад мае вялізны патэнцыял для вытворчага турызму, цяпер гэта актыўна развіваецца. Оршу вылучае лён, які праходзіць праз усё наша жыццё. А там жа і інстытут лёну, і аршанскі льнокамбінат. Салігорск падае прыклад, як быць маладым і ў той жа час культываваць сваю гісторыка-культурную спадчыну. Беларусь заўсёды славілася сваімі тэхнарамі, і Салігорск таксама гэтым вылучаецца. У Лідзе я б вылучыла непаўторную гістарычную частку і супрацоўнікаў музея, якія вельмі добра адчуваюць час.

— Валянціна Іванаўна, доўгі час ідуць размовы аб стварэнні турыстычнага брэнда Беларусі, але выніку няма. На вашу думку, «Вытокі» змогуць паспрыяць яго з'яўленню?

— Я адкажу: і так, і не. Дзякуючы «Вытокам» мы ўбачылі, што рэгіёны вельмі розныя і вельмі цікавыя самі па сабе. І ў выніку гэта можа аб'яднацца ў брэнд, як з нітак атрымліваецца дыван. Але да гэтага трэба прыйсці і ісці трэба менавіта ад рэгіёнаў. І, на мой погляд, наш слабы бок у тым, што рэгіёны часта капіруюць адзін аднаго, не вылучаюць свае адметнасці А брэнд — гэта адметнасць, тое, што вылучае. І калі самі рэгіёны вызначацца, чым яны адрозніваюцца, тады і ўзнікне брэнд краіны. Гэта як мазаіка, якая складаецца з розных кампанентаў. І вось дзякуючы «Вытокам» з'явіцца спачатку брэнды рэгіёнаў, а потым ужо і краіны. Сапраўды, былі розныя спробы зрабіць брэнд, і таленавітыя людзі іх рабілі. Але брэнд — гэта тое, што нельга проста так прыдумаць. Ён сам з'явіцца. Бо брэнд — гэта станоўчая рэакцыя на нешта, і каб яна ўзнікла, трэба самому зацікавіцца.

— Спіс гарадоў для правядзення фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» на наступны год ужо складзены?

— Не пакуль. Сёлета фестываль быў прысвечаны 30-годдзю Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Але я ўпэўнена, што спорт, здаровы лад жыцця, сямейныя каштоўнасці застануцца тэмамі праекта. Як і ўшанаванне свайго, беларускага. Аб гарадах ёсць час падумаць. Але магу сказаць, што з вялікай доляй верагоднасці гэта будуць гарады, аб якіх мы ведаем менш, чым яны заслугоўваюць.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з асабістага архіва гераіні і НАК Беларусі.

«ЧЫМ ВАЖНЫ ПАСЫЛ 17 ВЕРАСНЯ? НАЦЫЯ ХАЦЕЛА АБ'ЯДНАЦЦА...»

Упершыню сёлета мы будзем адзначаць прынцыпова новае для беларусаў свята — Дзень народнага адзінства. У ходзе дыскусій была вызначана дата — 17 верасня. Наўрад ці многія да гэтых часоў ведалі, чым яна адметная. А між тым, з гэтай датай звязана нямала канкрэтных гістарычных фактаў і падзей, якія паспрыялі аб'яднанню Заходняй і Усходняй Беларусі ў 1939 годзе. Аб некаторых значных момантах вызваленчага руху беларускага народа мы гутарым з кандыдатам гістарычных навук, загадчыкам кафедры турызму і культурнай спадчыны ГрДУ імя Янкі Купалы Андрэем ГЕЦЭВІЧАМ.

— Зразумела, што вераснёўскія падзеі 1939 года ў большай ступені датычацца Заходняй Беларусі, у тым ліку Гродна. Менавіта гэтая частка Беларусі знаходзілася пад уладай Польшчы, згодна з Рыжскім дагаворам 1921 года. Як тут развіваліся падзеі падчас паходу Чырвонай Арміі?

— У Гродне сітуацыя разгортвалася хуткімі тэмпамі, бо асноўныя баі ішлі пад Скідзелем, куды ў той час былі накіраваны асноўныя часткі польскай арміі. Яны займаліся падаўленнем паўстання, але не змаглі супрацьстаяць Чырвонай Арміі. Хоць і ў Гродне таксама ішлі баі, асабліва складаная была сітуацыя на ўзбярэжжы ракі Нёман...

— Раскажыце больш падрабязна пра Скідзельскае паўстанне...

— 17 верасня мясцовыя актывісты і былыя члены КПЗБ раззброілі польскую паліцыю і ваенных і авалодалі ўсімі знакавымі аб'ектамі Скідзеля. Рэвалюцыйны камітэт з ліку васьмярых паўстанцаў накіраваў ганцоў у навакольныя вёскі, каб яны абвясцілі аб устанаўленні ў Скідзелі савецкай улады. Многія жыхары вёсак таксама выказалі жаданне далучыцца да паўстанцаў. Аб гэтых падзеях на другі дзень, 18 верасня, даведаліся ў Гродне. Польскія ўлады накіравалі туды эшалон з вайскоўцамі. Паўстанцы перахапілі яго і забралі зброю. Пры гэтым ніякіх забойстваў не было. Іх проста адпускалі. У сваю чаргу, палякі сабралі добраахвотны атрад, які пайшоў у наступленне на ўдзельнікаў вызваленчага руху. Рэвалюцыйны камітэт адступіў у лес. А ў гэты час польскі атрад пачаў жорсткую расправу над мясцовымі актывістамі. Быў закатаваны 31 партызан.

— І гэта адбывалася ў той самы час, калі Чырвоная Армія была літаральна пад Скідзелем?

— Так, менш чым за дзень да прыходу Чырвонай Арміі. Ноччу 20 верасня ў Скідзель былі накіраваны польская кавалерыя і артылерыя. У гэты час паўстанцы, што былі ў лесе, з боем рухаліся да цэнтра Скідзеля. Аб тым, што сюды хутка падыдуць савецкія танкі, яны не ведалі. А між тым, менавіта дзякуючы часцям Чырвонай Арміі, што з'явіліся ў патрэбны час, было спынена масавае забойства палякамі скідзельчан. Дзвесце гараджан ужо вялі да вёскі Котра, каб расстраляць...

— Сапраўды, гэтыя факты мала хто ведае...

— Пазней, у 1940 годзе, адбыўся суд над тымі, хто браў удзел у падаўленні скідзельскага паўстання, многія панеслі заслужанае пакаранне. Але доўгія гады само паўстанне амаль нідзе не згадваецца. Хоць яно — яркі прыклад вызваленчай барацьбы невялікага гарадка пад Гроднам. Да таго ж гэта адзін з тых эпізодаў, дзякуючы якому разарваная гістарычнымі абставінамі Беларусь змагла аб'яднацца ў адну краіну.

— Як вы бачыце ўвекавечанне тых падзей? Я маю на ўвазе мемарыяльны аспект у гарадскім асяроддзі.

— Памяць пра тых, хто не шкадаваў жыцця дзеля аб'яднання беларусаў, не павінна згаснуць. Гэтых людзей, як і тыя падзеі, варта згадваць і прыкласці намаганні для ўшанавання іх памяці. Хоць бы стварыць мемарыяльную дошку ў гонар удзельнікаў Скідзельскага паўстання. Бо ў грамадстве мала хто чуў ці памятае пра яго. У Гродне ёсць вуліца 17 Верасня. Было б лагічна паставіць нейкі манумент у скверыку альбо памятны знак у горадзе, прысвечаны падзеям аб'яднання Беларусі ў адну дзяржаву.

— Чаму, на ваш погляд, гэта знакавая падзея?

— Чым важны пасыл 17 верасня? Нацыя хацела аб'яднацца. Гэта галоўны пасыл. Палякі праводзілі палітыку апалячвання, якая не падабалася большасці беларусаў. Беларускія школы зачыняліся, беларускія грамадска-палітычныя арганізацыі былі забароненыя, беларусы былі выціснутыя з палітыкі. За перыяд знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, а гэта амаль 20 гадоў, прысутнасць беларускага асяроддзя ў палітычнай, сацыяльнай, культурнай сферах стала мінімальнай. Ад гэтага расла і незадаволенасць грамадства.

У сваю чаргу, савецкай уладай у агітацыйнай рабоце сярод насельніцтва Заходняй Беларусі рабіўся ўпор на тое, што беларускі народ мае сваю дзяржаўнасць у складзе Савецкага Саюза. А частка беларусаў, аддзеленая па несправядлівым Рыжскім дагаворы 1921 года, знаходзілася ў іншай краіне і не мела нават статусу нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Таму многія беларусы і ў той час падтрымлівалі ідэю аб'яднання. Нізавыя ячэйкі КПЗБ праводзілі работу па агітацыі насельніцтва. І гэта вельмі важны фактар.

— Невядома, як склаліся б ваенныя падзеі першага этапу Вялікай Айчыннай вайны, калі б граніцы былі іншыя...

— Менавіта заходнія граніцы прынялі на сябе першы і самы магутны ўдар нямецкай арміі. Гэта, хоць і ненадоўга, але стала стрымальным фактарам у наступленні нямецкай арміі. Менавіта на гэтых граніцах пачаў прабуксоўваць план «Барбароса», які быў скіраваны на тактыку бліцкрыгу, гэта значыць хуткай перамогі. Таму аб'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі мела яшчэ і стратэгічнае ваеннае значэнне.

— Мы шырока святкуем Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці. На ваш погляд, чаму Беларусі патрэбны і Дзень народнага адзінства?

— Тое, што беларусы змаглі аб'яднацца ў адну краіну, — вельмі важны грамадскі і палітычны фактар. У XX стагоддзі прыкладаў аб'яднання раздзеленых нацый у адну дзяржаву дастаткова. Напрыклад, у 1976-м аб'яднаўся В'етнам, у 1990 годзе тая ж Германія таксама аб'ядналася ў адну краіну. У той жа час мы назіраем і адваротныя працэсы, якія прыводзяць краіны да драблення. І такіх прыкладаў, на жаль, апошнім часам становіцца ўсё больш. А гэта не заўсёды мірныя працэсы, часта за імі стаіць нямала ахвяр. Магчыма, і на беларускую тэрыторыю знойдуцца жадаючыя. Гэта вельмі прывабны рэгіён у цэнтры Еўропы. Таму важна захаваць адзінства і ўспомніць той момант, калі яно адбылося. А гэта менавіта 17 верасня 1939 года.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Ёсць такая патрэба — выгаварыцца

Чарговы рэгіянальны форум «Беларусь адзіная» сабраў лідараў грамадскай думкі ў Гомелі

Удзельнікі сустрэчы — эксперты з Мінска, кіраўніцтва аблвыканкама і актыў рэгіёна — сустрэліся ў канферэнц-зале Гомельскага абласнога грамадска-культурнага цэнтра. Каб паслухаць выступленні спікераў, падзяліцца сваім бачаннем актуальных пытанняў развіцця краіны, у Гомель прыехалі і дэлегацыі ўсіх раёнаў вобласці. Рэгіён на форуме прадставілі кіраўнікі структур і ведамстваў, работнікі сацыяльнай сферы, арганізацый і прадпрыемстваў, дэпутаты, члены грамадскіх аб'яднанняў, журналісты, а таксама актывісты маладзёжнага руху. Абавязковая ўмова — жывы дыялог удзельнікаў. Спікерамі былі вядомыя беларускія палітолагі — Вадзім Гігін, Аляксей Аўдонін, Аляксей Дзермант, Аляксандр Шпакоўскі і Анастасія Баброва.

Фота БЕЛТА.

Эксперты пасля першых сустрэч форумнага марафону адзначылі: падобныя мерапрыемствы дазваляюць плённа абмяркоўваць усе хвалюючыя пытанні. Для рэгіёнаў гэта і магчымасць заявіць пра сябе. Пра важнасць правядзення падобных «мазгавых штурмаў» у абласцях краіны казаў **дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзім ГІГІН.** Ён заўважыў, што ідэя належыць менавіта рэгіёнам.

— Да нас звярнуліся з такім пасылам, што свята 17 верасня будзем адзначаць упершыню ў Год народнага адзінства, таму хацелася б правесці пэўныя акцыі ва ўсіх рэгіёнах краіны. Мы сталі думаць, што арганізаваць, і тут зноў жа самі людзі падказалі — а давайце проста пагаворым. Тыя эксперты, якія выступаюць на тэлеэкранах, на нашых каналах, у нашых сродках масавай інфармацыі, расійскіх, замежных, проста прыедуць пагутарыць з людзьмі. Не было і няма ніякага сцэнарыя, ніякай зададзенай тэмы. Мы вырашылі задаць тыя напрамкі, у якіх кампетэнтныя, — адзначыў дэкан.

Ён падкрэсліў, што каштоўная сама форма выказвання меркаванняў — гутарка выбудоўваецца такім чынам, што атрымліваецца не лекцыя, а менавіта дыялог. Эксперты хочуць пачуць і данесці да сталіцы (і для сябе зразумець) усё тое, што думаюць на месцах па актуальных пытаннях нашага грамадска-палітычнага жыцця.

У цэнтры ўвагі рэгіянальных форумаў — палітыка, ідэалогія, геапалітыка, работа сродкаў масавай інфармацыі, эканоміка, сацыяльная сфера. На абмеркаванне выносяцца і такія тэмы, як партыйнае будаўніцтва, канстытуцыйная рэформа, эканамічная мадэрнізацыя. Спікеры выказваюць свае думкі, зыходзячы з ацэнак падзей мінулага года.

— Нашы апаненты часта кідаюць папрок, што мы хочам вярнуцца да 9-га жніўня. Ды не! Наадварот, бо ўсе гэтыя ўзрушэнні, якія маглі быць навязаныя разам з «каляровай рэвалюцыяй», усіх нас прымусілі па-новаму паглядзець на сябе, на сваю краіну, — падкрэсліў Вадзім Гігін. — Зарадзілася вельмі шмат пазітыўнага ў гэты перыяд. І мы бачым, што, нягледзячы на рэгіянальныя адрозненні, мы сапраўды Беларусь адзіная! І адказы, якія даюць людзі, спадзяванні, якія выказваюць, перажыванні пэўныя, праблемы, якія яны падымаюць, — часцяком вельмі падобныя. І мы бачым, што гэта можна вырашыць толькі ўсім разам.

Паказальна, што дыялогавая форма рэгіянальных сустрэч вельмі запатрабаваная. Спікераў запрашаюць у розныя гарады, кіраўнікі прадпрыемстваў просяць выступіць перад калектывамі.

— Мы часта гаворым пра камунікацыі, маючы на ўвазе новыя сродкі зносін, але не трэба грэбаваць жывымі зносінамі. Яны самыя даверлівыя, — матывуе Вадзім Гігін.

Спікер перакананы: марафон, які крочыць па краіне напярэдадні Дня народнага адзінства, будзе мець працяг. Таму што ёсць такая патрэба ў людзей — выгаварыцца, растлумачыць сваю пазіцыю, пачуць меркаванне іншых, паглядзець на суседнія рэгіёны, і гэта вельмі важна, лічыць ён.

Цікавымі для абмеркавання ў Гомелі сталі выступленні аб перспектывах эканамічнага росту краіны, у тым ліку ў рэгіянальным аспекце. Разгледзелі ўплыў санкцый і ўзаемадзеянне з замежнымі партнёрамі, абмеркавалі перспектывы палітычнай трансфармацыі, статус Усебеларускага народнага сходу, узаемаадносіны з Расійскай Федэрацыяй і будаўніцтва Саюзнай дзяржавы.

Нагадаем, усяго запланавана правесці 10 рэгіянальных форумаў. Завершыцца работа дыялогавых пляцовак напярэдадні Дня народнага адзінства.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
27 жніўня 2021 г. № 33 (618)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ПА-ГАСПАДАРСКУ

«ХТО ПРАЦУЕ, ТАМУ ВАРТА ДАВАЦЬ ЗЯМЛЮ»

На выязной сесіі дэпутаты Брэсцкага аблсавета абмеркавалі праблемы фермерства

Выязное пасяджэнне сесіі Брэсцкага аблсавета праходзіла ў Ляхавіцкім раёне. Дэпутаты разгледзелі пытанне эфектыўнасці работы сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. Перад пленарным пасяджэннем удзельнікі сесіі наведалі некалькі такіх гаспадарак, а таксама азнаёміліся з работай Ляхавіцкага кансервавага завода.

Найлепшыя яблыкі і грушы

Адна са старэйшых фермерскіх гаспадарак Ляхавіцкага раёна «Уладзімір плюс» мае 18 гадоў гісторыі, спецыялізуецца на вырошчванні яблыкаў і чорных парэчак. На 50 гектарах яблыневага саду вырошчваюцца сусветныя сарты яблынь. Ёсць уласнае сховішча, дасканалая структура халоднага захоўвання дае магчымасць прапаноўваць на рынак прадукцыю амаль кожны год. Акрамя таго, кампанія працуе над аптымізацыяй упаковачных матэрыялаў.

Аграном гаспадаркі Яўген ДЗЕМІДОВІЧ паказаў плантацыі чорных парэчак, якія паспелі і гатовыя да ўборкі. Паводле водгукаў спецыялістаў і калег, кіраўнік гаспадаркі «Уладзімір плюс» працуе творча, выкарыстоўвае найноўшыя навуковыя распрацоўкі, значныя сродкі ўкладвае ў развіццё тэхнікі і тэхналогіі. Адсюль — вынікі.

Другая гаспадарка, якую наведалі, размешчана ў вёсцы Альхоўцы. «Яблыневы пасад» узнік год таму фактычна на пустцы. Але за гэты час у вытворчасць укладзена каля 5 мільёнаў еўра. Узведзены адміністрацыйна-гаспадарчыя пабудовы. Пасаджаны яблыневы сад, плануецца пасадка груш.

На кансервавы завод удзельнікі сесіі накіраваліся, каб пагаварыць аб перапрацоўцы прадукцыі. Завод сёння выпускае 150 найменняў вырабаў і купляе сыравіну ў прадпрыемстваў розных формаў уласнасці. Наведвальнікі змаглі пераканацца, што невялікае перапрацоўчае прадпрыемства працуе мабільна, тут выкарыстоўваюцца найноўшыя формы ўпакоўкі, каб задаволіць самы розны попыт патэнцыяльных пакупнікоў.

Пра ўзаемаадносіны вытворцаў і перапрацоўшчыкаў казаў пры адкрыцці сесіі **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** Губернатар таксама зрабіў акцэнт на беражлівым стаўленні да зямлі: «Як фермеру атрымаць зямлю, прапісана ў законе. Ёсць дакладная працэдура. А далей патрэбнае культурнае, беражлівае стаўленне, і вынікам стане высокая аддача. На гэта павінны звяртаць увагу мясцовыя органы ўлады. Хто працуе, таму і варта даваць зямлю».

Сродкі — у развіццё

Як сведчыць статыстыка, фермераў, якія ўмеюць працаваць, у рэгіёне нямала. На пачатак года ў вобласці было зарэгістравана 766 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. За апошнія пяць гадоў іх колькасць павялічылася на 18 працэнтаў, альбо на 114 гаспадарак. Цяпер у гэтым сектары эканомікі занята каля трох тысяч чалавек. У карыстанні СФГ знаходзіцца 37,4 тысячы гектараў, гэта ў паўтара раза больш, чым шэсць гадоў таму. За 2016—2020 гады валавая прадукцыя фермерскіх гаспадарак вырасла ў 2,1 раза, а доля ў сельгасвытворчасці вобласці павялічылася з 3,5 працэнта ў 2016 годзе да 5,3 — у 2020-м.

стар. 17

АКЦЭНТЫ

Таццяна РУНЕЦ:

«Прыняцце рашэння МВФ аб выдзяленні Беларусі мільярда долараў апраўданае і адэкватнае»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Вылучэнне Беларусі Міжнародным валютным фондам фінансавай дапамогі, эквівалентнай аднаму мільярду долараў, для мяне з'яўляецца цалкам апраўданым, адэкватным і чаканым ходам, паколькі гэтыя сродкі прызначаныя для падтрымкі эканомікі нашай краіны.

Здзіўляе іншае: шуміха, якая ўтварылася вакол гэтай падзеі, і заклікі збеглай апазіцыі аб блакіраванні рашэння, прынятага фінансавым інстытутам. Гэтыя дзеянні выглядаюць як мінімум антынароднымі, паколькі накіраваныя на ўшчамленне інтарэсаў простых беларускіх грамадзян, і палітычна суіцыдальнымі, бо лідары так званай апазіцыі імкнуцца нашкодзіць народу, ад імя якога яны нібыта выступаюць. Прыгледзьцеся больш уважліва і пераканайцеся самі, што гэтыя заклікі — не што іншае, як папулізм, магчымасць нагадаць замежным грантадаўцам пра сваё існаванне і падтрымаць свой рэйтынг, які імкліва падае.

Падобная рэакцыя так званых дэмакратычных сіл на аказанне дапамогі — гэта чарговае сведчанне іх нежыццяздольнасці і відавочна завышаных палітычных амбіцый.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

«Банкруцтва павінна разглядацца як выключная мера эканамічнай палітыкі»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ узяла ўдзел у рабочай сустрэчы, якую арганізавала Міністэрства эканомікі для выпрацоўкі адзінай пазіцыі ў далейшай рабоце над праектам закона Рэспублікі Беларусь «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці».

Як паведамілі ў профільнай камісіі, падчас сустрэчы, што праводзілася ў рэжыме відэаканферэнцсувязі, абмяркоўваліся пытанні ўзмацнення каардынуючай ролі мясцовых органаў улады ў сферы ўрэгулявання неплацежаздольнасці, прызначэння і дзейнасці антыкрызісных кіраўнікоў, захавання занятасці і іншыя.

— Банкруцтва павінна разглядацца як крайняя, выключная мера эканамічнай палітыкі. Задача ўлады — не спрашчаць працэдуру банкруцтва, а зрабіць усё максімальна магчымае для яе папярэджання. Калі існуе магчымасць пазбегнуць банкруцтва або знайсці добрага інвестара, гэта павінна быць зроблена, — падкрэсліла старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі.

У мерапрыемстве таксама ўдзельнічалі намеснік міністра эканомікі Дзмітрый Ярашэвіч, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Леанід Брыч, суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Віктар Шыльчонак, работнікі сакратарыятаў абедзвюх палат парламента.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

ГАЛОЎНАЕ – ГЭТА СТАБІЛЬНАСЦЬ

Так лічаць работнікі «Беларускага Дома друку». Пра гэта яны казалі, сустракаючыся з сенатарам

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ завітаў на старэйшае паліграфічнае прадпрыемства, каб пазнаёміцца з яго вытворчымі вынікамі, пагутарыць з калектывам, даведацца аб тым, што хвалюе людзей.

Падчас размовы з кіраўніцтвам Дома друку парламентарыю расказалі аб росце экспарту на 40 % за мінулы год, адсутнасці цякучасці кадраў (у калектыве, дзе працуе амаль 600 чалавек), сярэднім заробку, які дасягае 1200 рублёў, і іншых важных вытворчых паказчыках. Гаворка зайшла і аб настроях у калектыве, маўляў, хістанняў няма. Але, як той казаў, словы словамі, але тое, пра што думаюць самі людзі, сенатар вырашыў даведацца ў цэхах. Актуальнай сустрэчы размовы стала абмеркаванне «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» – фактычна цэнтральнай падзеі гэтага месяца. Цікава, але факт: звычайныя людзі ад станка ўважліва сачылі за выказваннямі кіраўніка дзяржавы: хтосьці глядзеў урыўкамі па тэлебачанні, хтосьці чытаў у сецяве, але ўсе як адзін з парадкам дня нашай дзяржавы і пазіцыяй яе лідара знаёмыя. Друкар Юрый лічыць, што самае галоўнае – каб эканоміка нармальна функцыянавала і было спакойна ў краіне:

– Тут працуе шмат адукаваных людзей, і яны, як і я, перакананыя, што нам трэба згуртавацца, стаць адзіным у памкненнях грамадствам і працаваць на дабрабыт нашай дзяржавы – іншага шляху няма, – перакананы рабочы. – А санкцыі, да якіх заклікаюць Захад тыя, хто лічыць сябе часткай беларускага народа, адбіваюцца на простым чалавеку, такім, як я, таму мяне яны абураюць.

З ім згодны і калега па цэху – друкар Аляксандр, які працуе тут 10 гадоў. Ён расказаў Сяргею Рачкову, што заробак атрымлівае нядрэнны і рады таму, што можа працаваць і ўтрымліваць сваю сям'ю.

– А чаго глядзець у бок Захаду, калі мы жывём тут і цяпер? Я лічу, што добра там, дзе мы ёсць, – кажа ён і працягвае тэму санкцыйнай палітыкі калектыўнага Захаду. – Па кім б'юць санкцыі? Ціханоўскай выгадна, каб людзі за талерку рысу выходзілі на плошчы. Ёй абсалютна ўсё роўна, з чаго будуць жыць сем'і беларусаў.

На іншым участку друкар Пётр, які тут працуе 20 гадоў, расказаў сенатару, што галоўная каштоўнасць, якая для яго самая важная, – гэта стабільнасць:

– Ад стабільнасці ў краіне залежыць і стабільнасць на прадпрыемстве, – кажа ён. – А што добрага ад санкцый?! Калі яны ўводзяцца супраць краіны, значыць, і супраць мяне.

Ён і астатнія яго калегі, з кім давялося пагутарыць Сяргею Рачкову, былі аднадушныя ў тым, што свая краіна – найдаражэйшая, наймілейшая і самая жаданая. На яе карысць яны і будуць сумленна працаваць, каб і далей мець магчымасць атрымліваць годны заробак.

Акрамя даверлівай гутаркі з рабочымі, старшыня профільнай камісіі на ўчастку спецдруку пазнаёміўся з працэсам вытворчасці біяметрычных пашпартоў.

Дарэчы, дызайн новага дакумента распрацоўваўся ў тым ліку і тут. Цяперашняе пасведчанне асобы мае шматфактарную ступень засцярогі ад падробкі, але вонкавы выгляд вокладкі дызайнеры пастараліся захаваць, як у «папярэдніка». Ужо зусім хутка – на наступным тыдні – першая партыя біяметрычных пашпартоў, надрукаваная ў Беларускім Доме друку, накіруецца ў органы ўнутраных спраў для выдачы насельніцтву.

Падводзячы вынікі свайго рабочага візіту на прадпрыемства, Сяргей Рачкоў у гутарцы з журналістамі расказаў, што ўражаны перш за ўсё стасункамі з тутэйшымі людзьмі:

– Мы сёння закраналі тыя тэмы, якія паднімаў Аляксандр Лукашэнка падчас 8-гадзіннай сустрэчы з журналістамі, блогерамі, прадстаўнікамі грамадскасці і экспертамі. І я адчуў, што нашы людзі, нягледзячы на іх занятасць, сочаць за падзеямі ў краіне, па-за яе межамі і за выступленнямі кіраўніка дзяржавы, – адзначыў сенатар.

Ён падкрэсліў, што асноўная думка, якая неаднаразова гучала ад людзей, – гэта пытанні эканомікі, нацыянальнага адзінства, тое, што з'яўляецца фундаментам дзяржавы і забяспечвае яе бяспеку, спакой і стабільнасць.

– Людзі хочуць стабільнасці. Вы ведаеце, я задаў пытанне адносна змяненняў у Канстытуцыю, людзі аб гэтым ведаюць і разумеюць, што гэта – Асноўны Закон жыцця. Яны разумеюць, як будзе працаваць эканоміка, прадпрыемствы, яны на сваім рабочым месцы – ад гэтага будзе залежаць будучае іх сем'яў, дзяцей і ўнукаў. Можа, гэта гучыць крыху трывіяльна, але ў гэтым – сутнасць жыцця, – рэзюмаваў старшыня профільнай камісіі.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

КАМУНАЛЬНАЯ ТЭМА СЫХОДЗІЦЬ У АРХІЎ?

Так ці не, але зваротаў са скаргамі на ЖКГ у профільныя камісіі Савета Рэспублікі становіцца менш

На гэта звярнуў увагу старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ падчас свайго прыёму грамадзян па асабістых пытаннях, які сенатар правёў у будынку верхняй палаты парламента.

– Апошнім часам мы практыкуем правядзенне адзіных дзён прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі, – нагадаў сенатар у гутарцы з журналістамі аб новай форме работы. –Ужо правялі прыёмы ў Мінскім раёне, Віцебскай вобласці і сталіцы. Але, тым не менш, раз на месяц абавязкова ў будынку Савета Рэспублікі старшыні пастаянных камісій праводзяць прыём грамадзян.

На пытанне аб сезонным характары некаторых зваротаў сенатар заўважыў, што ў пачатку дзейнасці сенатарскага корпуса сёмага склікання да яго як старшыні камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы звярталіся ў тым ліку і з камунальнымі праблемамі. Цяпер людзі стараюцца больш звяртацца па профілі камісіі: у дадзеным выпадку заяўнікі прыходзяць з просьбамі па сферах, дзе задзейнічаны сілавыя структуры, праваахоўныя органы, суды.

Аднак менш – не азначае поўную адсутнасць. Не так даўно, прыгадаў Сяргей Рачкоў, на прыёме, які ён праводзіў у Сеніцы, чалавекам узніклі пытанні, звязаныя з добраўпарадкаваннем тэрыторыі, дарогамі, пешаходнымі пераходамі.

– І цяпер мне было прыемна адказаць заяўніку, што паднятыя ім пытанні былі станоўча вырашаны, – адзначыў сенатар. Ён акцэнтаваў увагу, што, сапраўды, пры правядзенні аналізу зваротаў грамадзян у Савет Рэспублікі камунальная тэматыка застаецца ў лідарах, аднак людзі сталі больш увагі аддаваць профілю камісіі і звяртацца канкрэтна на адрас.

У прыватнасці, сенатар звярнуў увагу на прыклад, які закранае інтарэсы міжнароднай дзейнасці і больш адносіцца да катэгорыі прапаноў. Так, на папярэдні прыём грамадзян з Сяргеем Рачковым прыйшла жанчына, якая ўнесла прапанову аб рабоце Еўразійскай эканамічнай камісіі.

– Яна агучыла ідэі, якія былі дастаткова цікавыя, – расказаў старшыня профільнай камісіі. – Мы іх накіравалі ў адпаведныя ведамствы і цяпер атрымалі станоўчы водгук, што гэтыя прапановы будуць выкарыстаны пры падрыхтоўцы пасяджэння з удзелам беларускіх дэлегацый у пасяджэннях ЕЭК.

Што датычыцца сённяшняга прыёму грамадзян, то тут да сенатара звярнуліся чатыры чалавекі: аб'ядноўвае іх, прынамсі, толькі тое, што ўсе агучаныя праблемы звязаны з жыццёвымі абставінамі.

Сталая жанчына расказала аб сітуацыі, якая хвалюе яе ўжо каля 20 гадоў, – гэта зацяжны канфлікт з суседам па дачным участку.

– Вядома, яна спрабуе яго вырашыць і сцвярджае, што не знаходзіць водгуку ў прадстаўнікоў улады, якія не жадаюць ёй дапамагчы, – расказаў Сяргей Рачкоў. – У такой сітуацыі вельмі складана разабрацца, але, тым не менш, нягледзячы на тое, што гэта гісторыя цягнецца ўжо доўгі перыяд часу, мы зробім адпаведныя запыты, пацікавімся ў сельскім выканаўчым камітэце веданнем праблемы, падключым праваахоўныя органы больш высокага ўзроўню, якія дадуць ацэнку разгляду сітуацыі і папярэдніх заяў ніжэйшымі арганізацыямі.

Таксама прагучаў зварот, звязаны з прысудам па наркатычнай праблематыцы:

– Мы прынялі вельмі жорсткі, але правільны закон, каб паставіць бар'ер перад распаўсюджваннем наркотыкаў, – перакананы старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. – Зразумела, бацькі маладых людзей, якія атрымліваюць прысуд у выглядзе дзесяці і больш гадоў зняволення, лічаць, што гэта надзвычай жорсткі падыход.

Ён нагадаў, што праблема з распаўсюджваннем наркатычных сродкаў у грамадстве дастаткова сур'ёзная.

– Мы адсочваем практыку выкарыстання гэтага закона і бачым, што дзеянні ў гэтай сферы рэзка скараціліся, – адзначыў ён пазітыўны момант. – Таму, на наш погляд, пакуль заўчасна паслабляць дзеянне гэтага закона, бо яго прыняцце было абгрунтаванае. Але жыццё ідзе наперад і мы разлічваем, што ў нейкі момант зможам унесці змяненні, якія дазволяць перагледзець па гэтым артыкуле (328 КК. – **Заўв. аўт.**) тэрміны пакарання.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.

❍ Зваротная сувязь

Апаратыўна і кампетэнтна

На мінулым тыдні ў Савет Рэспублікі прыйшоў зварот аднаго з заяўнікаў, які прасіў пасадзейнічаць у кампенсацыі страт, панесеных у выніку дарожна-транспартнага здарэння, што здарылася не па яго віне.

Дадзенае пытанне было ўзята на кантроль старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццянай Рунец і адпрацавана разам са страхавой кампаніяй «Белдзяржстрах».

Як паведамілі ў профільнай камісіі, ужо 25 жніўня – літаральна праз некалькі дзён пасля звароту – у парадку страхавога пакрыцця грошы паступілі на асабісты рахунак заяўніка, які падзякаваў сенатару за аператыўнае і станоўчае вырашэнне важнага для яго пытання ў рамках дзеючага заканадаўства.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

Гэта цікава

НА ЭКРАНЕ — «СУРАЗМОЎЦЫ»!

На «Беларусь 3» — новы выпуск аўтарскай праграмы

На тэлеканале «Беларусь 3» выходзіць аўтарская праграма беларускага пісьменніка Навума Гальпяровіча. «Суразмоўцы» здзейснены ў фармаце адносна кароткіх, па 15 хвілін, гутарак. Героі праграмы — культурныя дзеячы. Але, як адзначае сам Навум Гальпяровіч, культурнае асяроддзе складаецца не толькі з мастацкіх прафесій.

— Гасцямі і героямі праграмы становяцца творцы культурнай прасторы Беларусі ў шырокім сэнсе гэтага слова: навукоўцы, педагогі, пісьменнікі, мастакі, грамадскія дзеячы, — кажа ён.

Вось што цікава: за час існавання праграмы атрымаўся пэўны зрэз. Так, запрашаючы ў сваю студыю сучасных беларускіх пісьменнікаў, аўтар пры ўдзеле суразмоўцы актуалізуе праблемы ў галіне культуры, у прыватнасці літаратуры, якія неабходна вырашыць. Героямі праграмы былі Людміла Рублеўская, Уладзімір Сцяпан, Алена Мальчэўская, Мікола Адам і шмат іншых вядомых асоб.

Але важна і тое, што Навума Гальпяровіча, акрамя размоў пра актуальныя для сучаснай культуры пытанні, таксама цікавіць асабістае — унутраны свет герояў, іх памкненні і мары. Сваім тэмпам і атмасферай «Суразмоўцы» нагадваюць «Белую студыю» — вядомую перадачу тэлеканала «Культура». Але пры гэтым праграма Гальпяровіча захоўвае ўласны, аўтарскі почырк.

У новы выпуск «Суразмоўцаў» вядучы запрасіў паэта, фотакарэспандэнта газеты «Звязда» Яўгена Пясецкага. Паглядзім, якая атрымалася гаворка!

На тэлеканале «Беларусь 3» праграма выйдзе 28 жніўня ў 20:25.

Арына КАРПОВІЧ.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 127

Сваю новую задачу прапануе наш актыўны чытач Міхаіл Кошаль з Мінска ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крg1, Фd6, Ла4, Лf3, Сe6, Cf4, Kd2, Kh6, пb2 (9).

Чорныя: Крd4, Лd3, Cb7, Ka3, Ka6, пп. c4, d5, f6, g6 (9).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У горадзе Ясы (Румынія) прайшоў жаночы чэмпіянат Еўропы (117 удзельніцаў). Выйграла яго гросмайстар Эліна Данізлян (Арменія). З беларусак найлепшы вынік паказала Вольга Бадзялька — 11-е месца. Яна Ільючык — на 43-м месцы (выканала норму міжнароднага майстра), Аляксандра Тарасенка — на 59-м (найлепшы вынік сярод дзяўчат да 16 гадоў), Ксенія Зелянцова — на 97-м. Вось адна з пераможных партый нашых суайчыннiц.

Аляксандра Тарасенка — Элізабет Хапала. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 Cb4 4. Kf3 c5 5. g3 Kc6 6. Cg2 Ke4 7. Cd2 K:d2 8. Ф:d2 cd 9. K:d4 0-0 10. Kc2 Ce7 11. Лd1 a6 12. 0-0 Фc7 13. Ke4 Ke5 14. b3 d6 15. f4 Kg6 16. Ke3 f5 17. Kf2 Лb8 18. Kc2 Kph8 19. e4 fe 20. C:e4 e5 21. Ke3 ef 22. Kd5 Фd8 23. C:g6 fg 24. Ke4 hg 25. Kf4 Фb6+ 26. Kph1 Cf5 27. K:g3 Фc6+ 28. Kd5 Ch3 29. Л:f8+ Л:f8 30. Фe3 Cd8 31. Лd4 b5 32. Лf4 Лe8 33. Фf2 Крg8 34. Ke4 bc 35. bc Фa4 36. Kec3 Фa3 37. Фg1 Фb2 38. Лf2 Фa3 39. Лf3 Cf5 40. Фf1 Фc5 41. a4 Ch4 42. Фg1 Ф:c4 43. Лf4 Ф:f4 44. K:f4 Лe1 45. Kfd5 Ch3 46. Ф:e1 C:e1 47. Ke4 Cd7 48. Kef6+ gf 49. K:f6+ Kpf7 50. K:d7 Ca5 51. Kb8 Крe6 52. Крg2 d5 53. K:a6 Крd6 54. Kpf3 Крc6 55. Крe3 Cc3 56. Крd3 Ce5 57. Kb4+ Крc5 58. Ka6+ Крd6 59. h3 Cg3 60. Kb4 Ce1 61. Kc2 Ca5 62. Kd4 Cd8 63. Kb3 Крe5 64. a5 Крf4 65. Крd4 Крg3 66. Кр:d5 Кр:h3 67. a6 Cb6 68. Крc6 Ca7 69. Крb7 Ce3 70. Kd2 g5 71. Kc4 Cf2 72. Kb6 g4 73. a7 g3 74. a8Ф g2 75. Фh8+ Крg3 76. Фg7+ Крf3 77. Фf6+ Крe2 78. Фe5+ Крf1 79. Фb5+ Крe1 80. Фb1+ Крe2 81. Фe4+ Крf1 82. Kc4 Крg1 83. Ke3 C:e3 84. Ф:e3+ Крf1 85. Фf3+ Крg1 86. Крc6 Крh1 87. Фf2, 1:0.

* * *

У Брэсце прайшлі юнацкія і дзявочыя першынствы Беларусі ў некалькіх узроставых катэгорыях — па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы. Сярод дзяўчынак да 8 гадоў у абодвух відах праграмы перамагла Насця Савасцянчук, да 10 гадоў — Кіра Ісафатава ў рапідзе і Ніка Венская ў бліцы, да 18 гадоў — Варвара Палякова ў абодвух відах. Сярод юніёраў да 8 гадоў найлепшыя былі Арцём Астапенка (рапід) і Давід Даброўскі (бліц), да 10 гадоў — Раман Дасюк (рапід) і Мацвей Савельеў (бліц), да 18 гадоў — Максім Царук у абодвух відах.

Там жа прайшоў бліц-турнір «Кубак чорнай пешкі» (110 удзельнікаў), прызавую тройку якога склалі Віталь Цецераў, Арцём Сіняўскі і Максім Царук.

* * *

У Гродне адбыўся традыцыйны шахматны фестываль, які складаўся з шасці турніраў (у тым ліку сярод дзяцей) і спаборніцтваў па бліцы і рапідзе. У горадзе над Нёманам сабраліся 223 шахматысты з чатырох краін. У галоўным турніры (101 удзельнік) прызёрамі сталі гросмайстар Кірыл Ступак (Беларусь), Арам Грыгаран (Арменія) і Сяргей Вашчылаў (Беларусь). Турнір па бліцы (117 удзельнікаў) выйграў Антон Сітнікаў (Украіна), па рапідзе (96 удзельнікаў) — Андрэй Малюш (Беларусь). Прайшлі і два турніры, дзе можна было выканаць норму міжнароднага майстра. У адным прызёрамі сталі Ашот Піліпасян (Арменія), Аляксей Чэрапаў і Юрый Ціханаў (Беларусь), у другім — Аляксандр Усаў, Ілья Макавееў (абодва — Расія) і Максім Царук (Беларусь).

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Лh7. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

Вадзім Жылко.

Поўны метр

РЫЦАРЫ І ДАМЫ ЗАГАВАРАЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Кіно ў эпоху каранавіруса... Калісьці гэтай тэме будуць прысвечаны цэлыя даследаванні. Як спыняліся праекты, людзі пераставалі хадзіць у кінатэатры... А кіно, тым не менш, жыло.

Зрэшты, адзін з важных праектаў кінастудыі «Беларусьфільм» паспеў выйсці да публікі якраз перад тым, як быў аб'яўлены першы каранцін. Гаворка пра фільм «Авантуры Пранціша Вырвіча» па рамане сучаснай пісьменніцы Людмілы Рублеўскай. Быў адзняты і так званы «поўны метр» — стужка для кінатэатраў, і серыял з чатырох серый, прызначаны для паказу на тэлеканалах. Адбыўся перадпаказ для прэсы, а рэспубліканская прэм'ера мусіла быць адкладзена. Перадпаказ завяршыўся важнай абвесткай, агучанай дырэктарам «Беларусьфільма» Уладзімірам Карачэўскім: стужка будзе мець і беларускамоўны варыянт.

Сёння кінастудыя ажывае, тут запускаюцца новыя праекты... Вярнуліся і да тых задум, якія былі адкладзены.

— Праект, над якім мы цяпер працуем, а менавіта выхад фільма «Авантуры Пранціша Вырвіча» на беларускай мове, планаваўся даўно, але прыступіць да яго рэалізацыі з-за ўсіх «ковідных» абставін мы змаглі толькі цяпер, — расказвае **вядучы рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм» Таццяна КОМАНАВА.** — Сцэнарый пісаўся Валянцінам Залужным на рускай мове па беларускамоўным рамане, каб мець магчымасць прадставіць і твор, і фільм на рускамоўны рынак. Але калі фільм завяршылі, мы зразумелі, што нам хочацца, каб быў і беларускамоўны аналаг. Каб мы маглі адчуць усю сакавітасць мовы, каларыт XVIII стагоддзя, у якім, як піша аўтар Людміла Рублеўская, жылі і дзёрзкія шкляры, і прыўкрасныя дамы, і рыцары, і фанабэрыстыя магнаты... Мова дае дадатковае адчуванне каларыту, адчуванне псіхалогіі тых людзей, якія жылі ў нашай краіне некалькі стагоддзяў таму.

— Прэм'ера фільма, некалькі можна зразумець з абвестак кінастудыі, плануецца на кастрычнік...

— Мы разлічваем, што цяпер кінапракат актыўна ўключыцца ў наша жыццё, і першыя беларускамоўныя крокі фільм зробіць якраз у поўным метры, а не ў тэлевізійным серыяле. Магчымасць убачыць яго ва ўсіх кінатэатрах стане сапраўднай кінападзеяй. Хочацца, каб глядач найперш сустрэўся з фільмам не як з «тэлепрадуктам» пад хатнюю вячэру. Каб прагляд стужкі стаў магчымасцю нейкага культурнага выхаду ў свет, які можна здзейсніць сяброўскай кампаніяй ці сям'ёй. Фільм касцюміраваны, прыгожы. Яго варта ўбачыць найперш на вялікім экране, а не на смартфоне ці планшэце.

— Рускамоўная і беларускамоўная версіі будуць аднолькава цікавыя гледачам?

— Мне падаецца, людзі самі выберуць тое, да чаго ляжыць душа. Камусьці, верагодна, акажацца прасцей паглядзець на рускай. Хтосьці, наадварот, пойдзе на беларускамоўны варыянт, нават не ведаючы мовы, каб пагрузіцца ў атмасферу беларускай гісторыі і потым, магчыма, паглядзець рускамоўную версію, калі штосьці будзе незразумелае. А яшчэ лепш звярнуцца да самой першаасновы — рамана. Думаю, гэта вельмі цікавая і «маркетынгавая» гісторыя — магчыма, пасля фільма нехта захоча пашукаць інфармацыю, хто такія Агінскія, Чартарыйскія, Сапегі, што сапраўды адбывалася ў той гістарычны перыяд на Беларусі. Кагосьці зацікавіць літаратурная падаплёка. Можа, хтосьці не ведаў, хто такая аўтар рамана Людміла Рублеўская, і зразумее, што акрамя Уладзіміра Караткевіча, якога ведаюць усе са школы, у сучаснай беларускай літаратуры шмат іншых цікавых аўтараў, што звяртаюцца да гістарычнай тэматыкі. Я думаю, у любым выпадку, на якой бы мове вы яго ні паглядзелі, гэты фільм мусіць абудзіць цікавасць да беларускай гісторыі. Мне здаецца, гэта звышзадача, якую кінастудыя фільмам перад сабой паставіла. І спадзяюся, мы яе выканалі.

Над агучваннем фільма на беларускай мове група працуе з вялікім энтузіязмам, намагаючыся зрабіць мову персанажаў сакавітай, каларытнай. А паралельна на кінастудыі адбываюцца іншыя праекты.

—У актыўнай здымачнай фазе два фільмы, — расказвае Таццяна Команава. — Першы — васьмісерыйны фільм пад рабочай назвай «Полымя пад попелам», гэта праект рэжысёра Івана Паўлава. У ім два гістарычныя перыяды. Кінастудыя ўвесь час звяртаецца да ваеннай тэматыкі, але тут гісторыя па сутнасці не ваенная, а пасляваеннага перыяду. Гісторыя пра тое, як маладыя людзі, якія з-за ўзросту не паспелі трапіць на фронт, аднаўляюць краіну пасля вайны. Яны добраахвотнікамі пайшлі размініраваць тэрыторыю Беларусі. І сучасная лінія — гісторыя сучасных ваенных, якія і да гэтага часу, праз дзесяцігоддзі, размініруюць беларускую зямлю, у іх бывае па некалькі соцень выклікаў на год на абясшкоджванне мін, снарадаў, якія ляжаць у зямлі з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Мы не думаем у мірны час, што такое ёсць побач з намі, а рэха вайны не сціхае. Праект мусіць быць завершаны ў 2022 годзе. А ўжо ў канцы гэтага года нашы гледачы ўбачаць маладзёжны альманах аўтараў і рэжысёраў-дэбютантаў Андрэя Грынько і Дзмітрыя Дзядка пад назвай «Гэта я, Мінск». Фільм прысвечаны нашай сталіцы, — гэта позірк на яе людзей зусім маладых, якія здымаюць свой першы поўны метр у гульнявым кіно.

Святлана ПЯТРОВА.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Мелодрама «Сельскі настаўнік» (12+).
13.05, 15.25 Меладрама «Верная сяброўка» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка (прамы эфір).
18.15, 0.50 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.30 Арэна.
1.10 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 19.35 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.25 Камень, нажніцы, папера (16+).
11.00 «На тыдзень» (16+).
11.50 «Да пабачэння» (16+).
12.40 Баявік «Дзень незалежнасці: адраджэнне» (12+).
14.50 Анімацыйны фільм «У госці да Робінсанаў» (16+).
16.30 Анімацыйны серыял «Сціч!» (0+)
17.00 «Суперлато».
17.40 «Арол і рэшка. Перазагрузка-3». (16+).
18.35 «Сакрэтны мільянер» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.20 «Тата папаў» (16+).
23.20 Хачу ў тэлевізар!

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Рыбныя каўбаскі па-забалацку.
8.05, 12.00, 20.20, 23.10 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20 «Каралеўства крывых люстэркаў». Мастацкі фільм (6+) [СЦ].
10.40 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
11.05 «Кадры жыцця». Палітык, пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Мікалай Чаргінец.
12.20 «Беларуская кухня». Качка з дранікамі.
12.50 «Наперад у мінулае».
13.15, 21.05 «Апошні дзень». Леанід Дзербянёў (12+).
13.55, 21.45 «Агарова, 6». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].
15.20 «Навукаманія» (6+).
15.50 «Вострaў скарбаў». Мастацкі фільм (6+).
19.15 «За жыццё!» Канцэрт Руслана Аляхно.
20.40 «Калыханка» (0+).
23.25 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.15, 9.10 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 21-ы тур.
9.55 Плаванне. Ліга ISL.
12.05 Хакей. Алімпійская кваліфікацыя.
14.05 Гандбол. SEHA-Ліга. Плэй-оф.
15.45 Гульні «на выраст».
16.20 Біятлон. Летні чэмпіянат свету. Нове Места. Гонка пераследу. Жанчыны. Мужчыны.
18.30 Правілы выцця беларускіх спартсменаў. В. Ганчароў. Хранікальна-дакументальны фільм.
18.50 Міні-футбол. Таварыскі матч. Беларусь — Іран.
20.50 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/8 фіналу.
22.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. 3-і тур.
23.50 Спорт цэнтр.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 1.40** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.35 Серыял «Участак» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Прапаганда» (16+).
21.35 Серыял «Прыгажуня» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.40, 0.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
11.35 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.30, 20.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 16.50 «Шэф-2». Серыял (16+).
18.30 «Па сутнасці».
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
22.00 «Скардзіцца дазваляецца».
0.50 «Самая карысная праграма» (16+).
1.45 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00, 10.10 Серыял «Страсці па Чапаю» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 2.35 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 18.00, 3.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.20, 4.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.00 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.15 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00, 22.00 «Назад у будучыню» (16+).
22.55 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
23.25, 0.10 Маст. фільм «Старыкі-разбойнікі» [СЦ] (12+).
1.30 Маст. фільм «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» [СЦ] (12+).
4.45 Серыял «Адрыў» [СЦ] (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.25 «Таямніцы Беларусі». (16+).
12.35 «Зроблена». Дакументальны праект.
12.55 «У людзях».
13.35 «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Дуэт па праве». (12+).
17.15 «60 хвілін».
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05, 23.10 Серыял «Перакаці-поле» (16+).
0.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.10 Беларусы (6+).
6.55, 8.25 Дэтэктыў «Задача з трыма невядомымі» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.25 Баявік «Забіць прытворшчыка» (16+).
11.55 Гісторыі выратавання (12+).
12.30, 13.50, 16.30 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
16.20, 19.40, 22.10, 23.45 Сёння. Галоўнае.
17.55 «ДНК» (16+).
19.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
22.15 «НЗ.by».
22.35, 0.00 Серыял «Вострaў асуджаных» (16+).
1.05 Серыял «Шэф» (16+).

8 канал

7.00, 14.40, 17.30, 21.10, 0.50 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад «Трансформеры прайм» (6+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Жыццё Харлі» (12+).
8.45 Серыял «Мандалорац» (12+).
9.25, 15.15 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).
10.10 Серыял «Інданезія».
10.50 Вестэрн «Тамстоўн: легенда Дзікага Захаду» (16+).
13.00 Серыял «Пэры Мэйсан» (12+).
13.50 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
14.45 Мультпарад «Монстры за працай».
16.00 Серыял «Чорнае каханне» (16+).
17.35 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
18.35 Серыял «Вострaў непатрэбных людзей».
20.05 Серыял «Бандыцкі Пецярбург» (16+).
20.55 «Вечарніца». «Пчолка Мая» (0+).
21.15 Драма «Бой з ценем» (16+).
23.15 Серыял «Варвары» (18+).

ВТВ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам». Дайджэст (16+).
9.00, 0.10 «Проста кухня» (16+).
10.00 «Каледж» (16+).
11.40 Серыял «Ералаш» (6+).
12.00 «Галерэя прыгажосці» (16+).
12.55 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
14.00 Анімацыйны фільм «Буслы» (6+).
15.50, 18.25 Серыял «Зусім летнія» (16+).
21.00 «Уральскія пельмені». Дзень сырка (16+).
22.35 «Наш рамонт» (16+).
23.15 «Рогаў у справе» (16+).
1.05 «Тата ў дэкрэце» (16+).
1.20 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
2.30 «Даеш моладзь» (16+).
4.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Вялікі Ух». «Павучок Анансі і чарадзейная палачка». «Прыгоды дамавічка». «Дом для Кузькі». «Казка для Наташы». «Вяртанне дамавічка». М/ф.
8.00 Вялікія і маленькія.
9.45 «Забытае рамяство». Дакументальны серыял.
10.00 «Мы — грамацеі!»
10.45 «Я крочу па Маскве». Мастацкі фільм.
12.00 Лісты з правінцыі. Вёска Аляксеева (Валагодская вобласць).
12.30, 0.40 Дыялогі пра жывёл. Новасібірскі заапарк.
13.10 «Калекцыя». Дакументальны серыял.
